№№69–70
(2995–2996)

8—11 мая 2009 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Не забудзьце падпісацца на «Народную Волю» на чэрвень і другую палову 2009 года!

Няхай на Беларусі заўжды будзе мір!

Ветэранам вайны здароўя і доўгіх гадоў жыцця!

Фотаэцюд Анатоля КЛЕШЧУКА.

КОМУ ВЕРИТЬ?

Павел Бородин отправляет белорусских ребят служить в Россию

Из диалога на российском телеканале RTVI 5 мая 2005 г. в программе "Народ против", в которой принимал участие и госсекретарь Союзного государства Павел Бородин:

С.ПОНОМАРЕВ (специалист по недвижимости): — Вопрос специфический, наверное, для нашего понимания — согласятся ли белорусские ребята служить в российской или союзной армии на территории России? Мы знаем, что происходит с нашей армией, и, насколько мне известно, условия службы в Белоруссии совершенно иные.

П.БОРОДИН: — На заседании Высшего Государственного совета в начале февраля было подписано соглашение по противовоздушной обороне, военно-техническому сотрудничеству.

С.ПОНОМАРЕВ: — Солдатик, которого мама направила в союзную армию, будет ли он служить на территории России, а если нет, то будет ли это единая союзная армия?

А.ВЕНЕДИКТОВ (ведущий): — В Чечне.

П.БОРОДИН: — Думаю, что будет без вопросов. И будет единая армия...

С.ПОНОМАРЕВ: — Вы не ответили на вопрос о простом белорусском парне, которому надо идти служить в нашу армию.

А.ВЕНЕДИКТОВ: — Он ответил.

П.БОРОДИН: — Он уже работает и он уже у нас учится, и он уже у нас будет служить.

Из стенограммы пресс-конференции Александра Лукашенко "Час с Президентом" 24.10.2003 г.:

Жур Светлана Федоровна, мастер МТЗ: — Александр Григорьевич, у меня такой вопрос. Меня как мать волнует вопрос наших сыновей. После объединения двух государств будут ли наши сыновья служить за пределами Беларуси?

Лукашенко А.Г.: — Я тоже на сей счет уже не единожды говорил, и вы знаете, этот вопрос — конек оппозиции. Они меня всегда, когда мы ставили вопрос на референдуме о Союзе Беларуси и России, упрекали в том, что вот Лукашенко хочет сыновей Беларуси послать в Чечню воевать... И мне эта тема, наверное, как и Вам, очень близка и знакома. И я Вам должен сказать, что я сам категорически против посылки наших военных за пределы Беларуси.

Я Вам приведу конкретный пример — пример, не связанный с Чечней, чтобы убедить Вас в том, что я категорически против того, чтобы наши ребята вообще выезжали по каким-то направлениям, даже миротворцами, за пределы Беларуси...

...Почему наши ребята должны гибнуть где-то там, в том числе и в Чечне?

[illegible]

РЕПЛИКА

Наталья Петкевич предложила белорусам питаться солнечной энергией. Хотя сама питается не только ей

"Наличие широкого ассортимента продуктов или товаров на полках в магазинах — вторично. Первостепенное значение имеет то, что мы можем видеть солнце, радоваться ему, ходить спокойно по улицам, растить детей. Нельзя привыкать к миру, нужно ценить каждое мгновение жизни, каждый шаг, сделанный властью во имя народа", — заявила первый заместитель главы Администрации президента **Наталья Петкевич** на открытии выставки "СМИ в Беларуси".

***

Скажите, Наталья Владимировна, Вы будете радоваться солнцу, если в Вашем кармане будет пусто, а дома останется голодным сын? А ведь многие белорусы не могут свести концы с концами. И это в первую очередь должно волновать Вас как государственное должностное лицо. Запомните: соловья баснями не кормят... Само-то Вы, небось, питаетесь не только солнечной энергией.

Склады БМЗ завалены прадукцыяй

З-за нерэалізаванай прадукцыі Беларускі металургічны завод страціў ужо не адзін мільён долараў.

Былы супрацоўнік БМЗ **Марат Афанасьеў**, які адпрацаваў на прадпрыемстве больш за 20 год на кіруючай пасадзе, дзівіцца экспартнай палітыцы прадпрыемства. *"Еўрапейскія спажыўцы прадукцыі хлобінскага гіганта (кампаніі Michelin, Goodyear, Continental і т.д.) яшчэ некалькі месяцаў таму не маглі перапрацоўваць такую колькасць матэрыялу. Аднак дырэктар завода Мікалай Андрыянаў, які апынуўся нядаўна ў бальніцы, усё роўна даваў цвёрдую ўстаноўку "вырабляць". Узнікае пытанне, навошта было вырабляць, калі гэты тавар немагчыма рэалізаваць!"* — цытуе былога супрацоўніка БМЗ "Беларускі партызан".

Агульную сітуацыю пагаршае тое, што металакорд можна захоўваць не больш за 3 месяцы. Адпаведна, падлічвае Марат Афанасьеў, БМЗ ужо страціў не адзін мільён долараў.

Паводле неафіцыйнай інфармацыі, сёння не толькі склады БМЗ, але і вытворчыя памяшканні проста завалены гатовымі вырабамі завода. У некаторых цэхах немагчыма нават прайсці. Днямі з'явілася непацверджаная пакуль інфармацыя аб тым, што адміністрацыя прадпрыемства збіраецца адправіць у вымушаны адпачынак каля дзвюх тысяч працоўных металакордавага цэха.

ПАЛІТКУХНЯ

Уладзімір Макей адправіцца ў СІЗА?

Як стала вядома "Народнай Волі", чарговае пасяджэнне Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі можа прайсці ў адной з камер следчага ізалятара на вуліцы Валадарскага ў Мінску.

"Тэма будучага пасяджэння, якое адбудзецца прыкладна напрыканцы мая — на пачатку чэрвеня —"Гуманізацыя сістэмы выканання пакаранняў у Рэспубліцы Беларусь. Ажыццяўленне грамадскага кантролю за выкананнем правоў чалавека ў месцах прымусовага ўтрымання", — *паведаміў "Народнай Волі" член Савета, ганаровы старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў* **Аляксандр Патупа**. — Проста на мінулым Савеце зайшла гаворка пра тое, што няблага было б зрабіць наступнае пасяджэнне выязным. Я прапанаваў арандаваць камеру ў СІЗА на Валадарцы. Калі прапанова будзе прынята, можна сказаць, што атрымаецца проста гістарычная падзея".

Нагадаем, што Грамадска-кансультацыйны савет узначальвае кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта **Уладзімір Макей**. Пакуль што ні на адно з пасяджэнняў Савета не былі дапушчаны прадстаўнікі незалежных сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку і "Народнай Волі".

Марына КОКТЫШ.

ШАЙ-БУ!

Шкада, што беларусы не паставілі Расію на калені

У мінулую сераду для хакейнай зборнай Беларусі чэмпіянат свету ў Швейцарыі скончыўся. Цуду не адбылося — беларусы прайгралі ў чвэрцьфінале дзеючым чэмпіёнам свету — расіянам.

Не хапіла зусім крыху. Беларусы па ходзе матча двойчы вялі ў ліку, пасля двух перыядаў на табло значылася — 3:3. Але ў апошнім перыядзе адной закінутай шайбы расіян аказалася дастаткова для перамогі.

Зрэшты, ужо сёння можна канстатаваць, што гэта адзін з самых удалых чэмпіянатаў для нашай зборнай, бо каманда прайграла толькі двойчы — тытулаваным расіянам і канадцам. І пасля апошняй гульні галоўны трэнер нашай зборнай Глен Хэнлан не без гонару канстатаваў: *"Я ганаруся сваёй камандай. У гульні з чэмпіёнамі свету, якія, няма сумненняў, мацнейшыя за нас па шэрагу пазіцый, мы паказалі добры хакей. У нас насамрэч быў шанц атрымаць перамогу, хлопцы рабілі для гэтага ўсё магчымае. Аднак лёс вырашыў інакш".*

Зрэшты, ніхто і на самай справе не кіне камень у агарод беларусаў пасля гульні з расіянамі, якія ледзь-ледзь вырвалі перамогу. І з гэтай нагоды ўспомніўся анекдот, калі студэнт прыязджае ў родную вёску, а маці яму кажа: *"Трэба забіць кабанчыка". — "Гэта без праблем",* — адказвае той. Праз некаторы час з хлява чуецца грукат, віскванне, выходзіць сын-студэнт увесь у брудзе і крыві. *"Забіў?"* — пытае яго маці. — *"Забіць не забіў, але па рыле добра надаваў".*

Алесь СІВЫ.

ТАМ, В ПРАГЕ...

Дан старт «Восточному партнерству»

В столице Чехии Праге состоялся саммит ЕС и шести постсоветских государств, на котором официально дан старт программе Евросоюза "Восточное партнерство".

В декларации пражского саммита выражена уверенность в том, что "Восточное партнерство" "будет работать на благо демократических ценностей, укрепления стабильности и процветания, принесет устойчивые и ощутимые преимущества гражданам всех стран-участниц". Отмечается, что новая программа ЕС основана на фундаментальных ценностях — демократии, верховенстве закона, уважении прав и свобод, принципах международного права, рыночной экономики, устойчивого развития и госуправления.

Инициатива призвана вывести на качественно новый уровень отношения ЕС с Арменией, Азербайджаном, Беларусью, Грузией, Молдовой и Украиной. Речь идет об укреплении экономического сотрудничества, введении режима свободной торговли, в перспективе — об ослаблении или отмене визового режима между ЕС и этими странами.

Словом, проект "Восточное партнерство" не предусматривает возможности членства в ЕС, но предполагает политическое и экономическое сближение с этой региональной организацией.

На программу "Восточного партнерства" предполагается потратить 600 миллионов евро — до 2013 года.

Впервые за все время своего существования Евросоюз провел саммит, участие в котором приняли сразу шесть бывших советских республик. Инициатива, к реализации которой приступает ЕС, впервые была озвучена Польшей и Швецией в прошлом году.

Новая программа ЕС вызывает недовольство России. Ее министр иностранных дел Сергей Лавров обвинял Евросоюз в попытке захватить новую сферу влияния в регионе, который Москва определяет как область своих "особых интересов". На днях Лавров заявил, что получил заверения от европейского руководства, что новая инициатива не направлена против России и ему бы "очень хотелось верить" в это.

ЕС неоднократно заявлял, что "Восточное партнерство" не антироссийская инициатива. "Мы лишь отвечаем на запросы, поступающие от этих стран. И экономическая реальность такова, что большую часть торговли они ведут со странами Европы", — говорит представитель ЕС.

Однако политическая реальность такова, замечает Би-Би-Си, что бывшие советские республики становятся ареной противостояния России и Европейского Союза.

Сергей ИВАНОВ.

Ивонка Сурвилла, Зенон Позняк, Станислав Шушкевич, Александр Козулин и Александр Милинкевич были приняты премьер-министром Чехии Миреком Тополанеком.

Политики находятся в Праге по приглашению министерства иностранных дел Чехии.

Акцыя беларусаў у Празе

Дзесяткі беларусаў сабраліся ў цэнтры Прагі ў дзень адкрыцця саміта, прысвечанага "Усходняму партнёрству".

Удзельнікі акцыі пратэставалі супраць парушэння правоў чалавека ў Беларусі.

Акцыя пачалася на плошчы Палецкага, у ёй прынялі ўдзел беларускія палітэмігранты, якія жывуць у Чэхіі і іншых еўрапейскіх краінах, а таксама жыхары Прагі. Пасля заканчэння мітынгу ўдзельнікі акцыі правялі шэсце да Кангрэс-цэнтра, дзе праходзіў саміт.

Міністра сустрэлі словамі «Ганьба!»

Калі машына з чырвона-зялёным сцяжком, на якой ехаў міністр замежных спраў Беларусі, спынілася каля Палаца, дзе збіраліся ўдзельнікі саміту, некалькі дзесяткаў беларусаў, якія стаялі побач у пікеце, пачалі скандіраваць "Ганьба!". З машыны выйшаў міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў і вельмі хутка, подбегам, накіраваўся ў будынак.

Удзельнікі пікета трымалі бел-чырвона-белыя сцягі, плакаты з надпісамі "Стоп, дыктатура", "Скажы лукашызму "Не", "Свабоду палітычным вязням у Беларусі" (на англійскай мове) і партрэт Юрыя Захаранкі з надпісам "Хто адкажа за злачынства?". Менавіта 7 мая ў 1999 годзе Юрый Захаранка, былы міністр унутраных спраў Беларусі, быў выкрадзены.

Юры ДРАКАХРУСТ.

Як бабруйскія аплаквальнікі СССР абразілі Алеся Адамовіча

У газеце "Бабруйскае жыццё" надрукаваны паклёпніцкія лісты ананімных ветэранаў на адрас выбітнага беларускага пісьменніка, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Алеся Адамовіча.

Прычынай неадэкватнай рэакцыі ананімных аўтараў стала публікацыя ў нумары за 25 сакавіка (!) артыкула журналіста Валерыя Зіноўскага. У ім аўтар выказваў надзею, што неўзабаве вуліцы горада пачнуць атрымоўваць адпаведныя часу назвы. Аўтар прапанаваў назваць адну з вуліц у гонар Алеся Адамовіча, які, як вядома, родам з вёскі Глуша, што на Бабруйшчыне.

Раз'юшаныя ананімы наступным чынам выказалі негатыўнае стаўленне да асобы пісьменніка: *"Пярэварытням і разбуральнікам вялікай Радзімы-СССР — няма і не будзе месца на нашых вуліцах".*

Народная Воля
http://www.nv-online.info
8—11 МАЯ 2009 г.

БЛІЦ

Еўрапейскія палітыкі і некаторыя журналісты ўсё часцей і часцей выказваюць думку, што ў Беларусі пачаліся палітычныя змены, што наша краіна стала на шлях лібералізацыі і дэмакратызацыі. А ці адчуваюць гэта тыя, хто жыве ў Беларусі?

"Народная Воля" папрасіла сваіх рэспандэнтаў адказаць на пытанне:

Ці заўважылі Вы зрухі ў бок дэмакратызацыі ў нашай краіне?

Людміла ГРАЗНОВА, дэпутат Вярхоўнага Савета 13-га склікання:

— Знікла адчуванне страху беспадстаўна апынуцца ў турме, беспадстаўна быць публічна скампраметаваным... Знік страх згубіць сваіх блізкіх. Пасля вызвалення з-за кратаў Казуліна, Кіма, Парсюкевіча надышло нейкае адчуванне спакою. Бадай упершыню за апошнія гады мы сталі адчуваць сябе людзьмі. І гэтае адчуванне дорага каштуе. Пакуль асабіста я не бачу падстаў для наступлення чарговай хвалі рэпрэсій.

Зміцер БАРТОСІК, бард:

— На маю думку, у палітычным жыцці ніякіх змен не адбылося. А вось як чалавек творчы заўважаю, што пазітыўныя зрухі ёсць. Напрыклад, у межах непалітычнай кампаніі "Будзьма", у якой я ўдзельнічаю, стала прасцей дамовіцца аб выступе ў тым ці іншым памяшканні. Нас сталі пускаць выступаць у школах, чаго раней не было. Праўда, праблемы ўсё ж такі застаюцца — дамовіцца аб выступленні ўдаецца не заўжды. Можа, лібералізацыя і дэмакратызацыя яшчэ не "накрылі" абсалютна ўсю краіну?..

Міхаіл ПАШКЕВІЧ, маладзёжны актывіст:

— Ніякіх грунтоўных ці зусім маленькіх крокаў у бок дэмакратызацыі і лібералізацыі ў Беларусі я не заўважыў. Беларускае кіраўніцтва працягвае сваю ранейшую палітыку. Усе гэтыя гульні з лібералізацыяй скіраваны на высокіх еўрапейскіх чыноўнікаў. Пагадзіцеся, не лічыць жа рэальнай дэмакратызацыяй тое, што днямі Мікола Лукашэнка павітаўся з Папам Рымскім...

Мікалай ПАХАБАЎ, кіраўнік Мінскай абласной арганізацыі прафсаюзаў радыёэлектроннай прамысловасці:

— Калі ў Беларусі зараз і адбываецца лібералізацыя і дэмакратызацыя, то яна носіць аднабаковы характар. І адчуваюць нейкія змены, скіраваныя на дэмакратызацыю, толькі прадстаўнікі ўлады. Асабіста я нічога падобнага не заўважыў. Вось вам яскравы прыклад: месяц таму мы спрабавалі зарэгістраваць пярвічныя арганізацыі ў Магілёве, Віцебску, Гомелі — нам паўсюдна адмовілі. "Пярвічку" ўдалося зарэгістраваць у Барысаве, але дамагаліся мы гэтага ажно два з паловай года... На сябраў нашага прафсаюза ажыццяўляецца ціск. У Салігорску на заводзе жалезабетонных канструкцый людзям, якія з'яўляюцца сябрамі РЭП, пагражаюць звальненнем... Пра якую дэмакратызацыю і лібералізацыю ў такім выпадку можна гаварыць?..

Алесь БЯЛЯЦКІ, праваабаронца:

— Асабіста я не адчуў ніякіх пазітыўных зрухаў. Вы ж ведаеце, што зусім нядаўна Вярхоўны суд адмовіў нашай праваабарончай арганізацыі ў рэгістрацыі. Такое самае рашэнне было і ў 2007 годзе. Так што, як бачым, за апошнія два гады Беларусь не стала на шлях дэмакратызацыі, бо права на свабоду стварэння грамадскіх аб'яднанняў, замацаванае, дарэчы, у Канстытуцыі, не выконваецца...

Леў МАРГОЛІН, эканаміст:

— Мне падаецца, што пасля абвяшчэння ў Беларусі курса на лібералізацыю і дэмакратызацыю ў дачыненні да прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, міліцыя стала дзейнічаць менш жорстка, чым раней. А так асаблівых зрухаў не адчуваецца. У эканоміцы, акрамя шырока разрэкламаванага кроку, які быў скіраваны на спрашчэнне рэгістрацыі прадпрыемстваў, нічога істотнага не зроблена. А можна было б адмяніць цэнаўтварэнне, якое зараз кантралюецца дзяржавай. Гэта надало б беларускай эканоміцы новы подых.

Апытанне праводзіў Антон ПАНАСЕВІЧ.

ЛЁС ЧАЛАВЕКА

Лятун

Ветэрану Вялікай Айчыннай вайны Ігару Сцяпанавічу Жабуртовічу восемдзесят сем! На ўскрайку Барысава — у доме, што месціцца ў прыватным сектары на вуліцы Адамовіча, ён жыве адзін. Ні жонкі, ні дзяцей у Ігара Сцяпанавіча не было ніколі. Сіл даглядаць гаспадарку і агарод у знямоглага ад хвароб ветэрана няма. Адзінае, што дапамагае яму жыць, гэта ўспаміны. Успаміны аб маладосці, аб тых гадах, калі ён быў летуном…

Нябёсы — прытулак дзёрзкіх

Летунамі адзін аднаго паміж сабой называюць лётчыкі. Ігар Жабуртовіч заўжды марыў сесці за штурвал самалёта — яго вабілі бяскрайнія і глыбокія нябёсы. Пасля заканчэння школы ў Клічаве ў 1939 годзе Ігар Сцяпанавіч паступіў у Ленінградскі ваенна-механічны інстытут. *"Аднак скончыць яго не давялося"*, — гаворыць ветэран. — *Згодна з рашэннем савецкага ўрада мая бронь-адтэрміноўка на навучанне была скасавана і восенню 1940 года я быў прызваны на вайсковую службу па профілю будучай інжынернай спецыяльнасці — у авіяцыю".*

Лётны полк, дзе ваяваў Ігар Жабуртовіч, фарміраваўся ў блакадным Ленінградзе. Якраз у гэты час Ігар Сцяпанавіч заканчваў ваенна-марское авіяцыйнае вучылішча па спецыяльнасці штурман самалёта-тарпеданосца. Адразу пасля атрымання спецыяльнасці Жабуртовіч трапіў на фронт...

"Нябёсы — прытулак дзёрзкіх, — гаворыць Ігар Сцяпанавіч. — *Я быў малады, дзёрзкі, вельмі хацелася трапіць на фронт... Ці было страшна? Ніколі не верце тым, хто скажа, што ў баі страшна не бывае... Вайна — гэта ў першую чаргу смерць. Але, шчыра кажучы, пра гэта тады не вельмі думалася..."*

Свой першы баявы вылет Ігар Жабуртовіч зрабіў 30 кастрычніка 1944 года: *"Балтыйскае мора тады яшчэ кантралявалі фашысты,* — узгадвае Ігар Сцяпанавіч. — *Яны гаспадарылі там. Нямецкімі лётнымі аэрадромамі было "ўсыпана" усё ўзбярэжжа.... У моры стаялі іх караблі. Умовы для атакі караблёў праціўніка былі складаныя. Згодна з тактыкай вядзення атакі нашыя самалёты не манеўрыравалі ў небе. Збіць нас было вельмі проста...*

Ігар Жабуртовіч добра памятае свой трэці бой, у якім патапіў першы фашысцкі карабель: *"Было гэта ў снежні 1944 года. Нямецкі флот праводзіў вялікую аперацыю ў Лібаве* (сучасная Ліепая. — **Аўт.**). *Караблі фашыстаў павінны былі дастаўляць нейкі груз. Наш фронт прыняў рашэнне атакаваць — у неба над Лібавай цягам пяці хвілін было ўзнята каля 300 самалётаў... Мой самалёт з бомбамі на борце знаходзіўся ў авангардзе атакуючых. Усяго ў авангардзе ішло 8 самалётаў. Мы павінны былі дзейнічаць вельмі хутка. Пачалі бамбіць. Бой для нашых самалётаў доўжыўся ўсяго 35 секунд... Дык вось з васьмі нашых самалётаў — пяць было зрэзана фашысцкімі караблямі. Жывымі з бою ў небе над Лібавай выйшла толькі тры... У гэтым баі мне і ўдалося патапіць першы карабель праціўніка".*

Дзень Перамогі Ігар Жабуртовіч сустрэў таксама ў баі: *"9 мая мы знаходзіліся на аэрадроме ў Кольтбергу,* — успамінае ветэран. — *Нашы самалёты знаходзіліся ў баявой гатоўнасці. Каля 100 фашысцкіх караблёў знаходзіліся ў моры, на ўсходзе ад Бархольма. Ім прапаноўвалі капітуляцыю... Але немцы не здаваліся. У неба было ўзнята 15 нашых самалётаў. Пасля таго як шэсць караблёў праціўніка былі патоплены, немцы выкінулі белы сцяг. Праўда, да гэтага яны паспелі збіць два нашых самалёты..."*

На рахунку Жабуртовіча 41 баявы вылет і 11 патопленых караблёў гітлераўцаў. За баявыя заслугі падчас Вялікай Айчыннай вайны Ігар Жабуртовіч быў двойчы ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і ордэнам Айчыннай вайны першай ступені.

«Паміраць мне рана яшчэ…»

Пасля вайны Ігар Сцяпанавіч працягваў служыць ва Узброеных сілах аж да 1954 года: *"Тады я не задумваўся, што калісьці прыйдзецца прызямліцца і больш не ўздымацца ў неба",* — гаворыць ён. — *Ведаеце, у Высоцкага ёсць радок "Нас з табою не спішуць у запас", вось і мне не хацелася пакідаць неба. Але на пенсію ў званні маёра запасу выйсці ўсё ж такі прыйшлося.*

Ці цяжка было адаптавацца да цывільнага жыцця? Не, я ж па складзе характару лятун, што ў небе, што на зямлі..."

Пасля выхаду на пенсію Ігар Жабуртовіч асеў у Барысаве: *"З сям'ёй і дзецьмі ў мяне не атрымалася... Не пытайся чаму, не адкажу ўсё роўна... Я заўжды жыў адзін, але ведаў, што павінен прыносіць карысць людзям".*

Дапамагла Ігару Сцяпанавічу прыродная цікаўнасць. Ён віртуозна асвоіў фотаапарат — стаў фатаграфаваць вяселлі, святы знаёмых. Акрамя таго, Жабуртовіч быў добрым электрыкам — суседзі і знаёмыя ведалі, што ў Ігара Сцяпанавіча залатыя рукі, таму і звярталіся па дапамогу. А ён і не адмаўляў — не ў яго характары.

"Старасць падкралася непрыкметна, — гаворыць ветэран. — *А я, ведаеш, не хачу мірыцца з уласным узростам. Зараз, канечне, ужо і сілы не тыя, як раней.... Балячкі павылазілі — пахавая грыжа, ногі слабыя зусім — гэта рэха вайны. Вайна, брат, выматвае..."*

Ігар Сцяпанавіч прынцыпова адмаўляецца ад паслуг сацыяльнага работніка. "Калі мне яшчэ і хлеб з малаком прыносіць будуць, то я зусім хадзіць перастану. А так ведаю, што калі сам сябе прадуктамі не забяспечу, то ніхто мне іх не прынясе. Дровы сам нарыхтоўваю, бульбу ў падвал сам спускаю. Корпаюся паціху...

У краму Ігар Сцяпанавіч ходзіць два разы на тыдзень: *"Узброіўшыся кійком, клыпаю паціху. Разумееш, прывык я адзін, не хачу ні ў дом састарэлых, не хачу, каб мне хлеб прыносілі. Усё прывык рабіць сам. Я ж лятун, а летуны — не здаюцца...*

Ці думаю аб смерці? Не, паміраць мне рана яшчэ, але для яе сустрэчы ў мяне ўсё гатова... Я 15 гадоў таму да яе падрыхтаваўся. Ты не здзіўляйся, я ж адзін жыву, таму і прыйшлося падумаць пра гэта загадзя..."

Ігар Сцяпанавіч вядзе мяне ў пакойчык, дзе пад накідкай з мешкавіны стаіць труна: *"Не трэба мне паказваць, што я, труны не бачыў",* — кажу ветэрану. *"Такой, як у мяне, не бачыў, павер",* — адказвае мне ветэран.

Жабуртовіч скідвае накідку з труны, і я бачу на накрыўцы два надпісы "ВКП(б)" і "КПСС". На самой труне чатыры літары - "СССР". *"Зараз я табе ўсё патлумачу,* — гаворыць Ігар Сцяпанавіч. — *Надпіс "СССР" я зрабіў, таму што я ваяваў за гэту неіснуючую ўжо краіну. "КПСС" — партыя, якой мы ўсе ў той час верылі. Ну, а "ВКП(б)" — нас жа ўсіх бальшавікамі з дзяцінства рабілі... Ад "акцябрат" — да "камсамола". А дзяцінства, як ні круці — лепшы час у жыцці... Вось такая ў мяне філасофія..."*

Кватэрнае пытанне

За ўсё жыццё Ігар Сцяпанавіч так і не навучыўся аднаму — прасіць. *"Але ведаеш, раз рызыкнуў, паспрабаваў папрасіць у дзяржавы аднапакаёвую кватэру — адмовілі".*

Вялікі прыватны дом на вуліцы Адамовіча быў пабудаваны ў 50-х гадах мінулага стагоддзя на месцы бункера. Тут было два гаспадары — Ігар Сцяпанавіч дзяліў жылую плошчу з суседкай, якая памерла некалькі гадоў таму. У кожнага з гаспадароў побач з домам кавалак зямлі: *"Раней было ўсё — і сад, і агарод, нават парася трымаў,* — гаворыць ветэран. — *А зараз не магу, сіл няма... Вось і зарастае ўсё тут..."* Вады ў той частцы дома, якая належыць Жабуртовічу, няма — калі б не дачка памерлай суседкі, якая дазволіла ветэрану жыць у пакойчыку суседкі, дзе ўсё ж такі праведзены водаправод, Жабуртовічу было б цяжэй: *"Калонка, канечне, побач ёсць, але што я са сваёй грыжай прынясу?",* — пытаецца сам у сябе ветэран.

Вось і стаў Жабуртовіч звяртацца ва ўладныя кабінеты з адной толькі просьбай — узамен кавалка прыватнага дома з зямельным участкам ветэран прасіў выдзеліць яму аднапакаёвую кватэру: *"Каб вада побач была, каб да ветру хадзіць на вуліцу не даводзілася. Ну што я, шмат прасіў? Памру ж, гэтая кватэра ўсё роўна дзяржаве адыдзе — у мяне ж ні дзяцей, ні жонкі..."*

Чыноўнікі адмовілі Жабуртовічу. *"Фармальна яны правы — у мяне ёсць жыллё. Я спачатку ўсе іх адпіскі складаў. А потым плюнуў ды спаліў... Чорт з вамі, адмовілі і ладна, але самае страшнае тое, што зараз чыноўнікі да людзей не па-людску ставяцца, без душы...*

Але што я разныўся? Усё добра будзе — летуны не здаюцца..."

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Барысаў—Мінск.

АДУСЮЛЬ

Уладзіміру Арлову зрабілі яшчэ адну аперацыю на сэрцы

Днямі пісьменніку Уладзіміру Арлову зрабілі чарговую аперацыю на сэрцы.

Як інфармуе БелаПАН, аперацыю правёў у Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры "Кардыялогія" (Мінск) прафесар **Алег Паланецкі**.

Арлоў добра перанёс аперацыю і цяпер адчувае сябе нядрэнна.

Нагадаем, 6 лістапада 2008 года пісьменніка прааперыравалі ў сувязі са стэнозам — звужэннем артэрый і дробнаачаговым інфарктам.

Жан-Клод Ван Дам зацікавіўся беларускімі спартсменамі

Беларускі баец змешанага стылю і былы чэмпіён па версіі UFC у цяжкай вазе Андрэй Арлоўскі здымаецца ў новым фільме Жана-Клода Ван Дама "Універсальны салдат: новы пачатак".

Як паведамляе агенцтва "Мінск-навіны", цяпер спартсмены на здымках у Балгарыі. Андрэй будзе іграць ролю незвычайнага злыдня. У баевіку рэжысёра Джона Хаймса таксама заняты такія вядомыя акцёры, як Жан-Клод Ван Дам і Дольф Лундгрэн.

Сяргея Новіка аддалі пад суд

Генеральная пракуратура завяршыла расследаванне крымінальнай справы ў адносінах да першага намесніка начальніка ўпраўлення па процідзеянні злачынствам у сферы высокіх тэхналогій МУС Беларусі Сяргея Новіка.

Новіка абвінавачваюць у тым, што ў сакавіку 2006 года ён схіліў раней судзімага да выкрадання грошай з банкаматаў пры дапамозе падробленых банкаўскіх картак.

Справу будуць разглядаць у судзе Цэнтральнага раёна Мінска.

Знеслі дом? Можаце пераехаць нават у «Дразды»

Уласнікі дамоў, якія зносяць у Мінску, з 1 мая могуць выбраць участак для будаўніцтва дома ў любым населеным пункце краіны. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік Беларусі.

Мінгарвыканкам абавязаны прапанаваць уласніку жылога дома, размешчанага ў сталіцы, магчымасць атрымаць участак для будаўніцтва без чаргі і аўкцыёну.

Квітней, Беларусь!

Апублікаваны спіс самых квітнеючых краін свету за 2008 год — штогадовы рэйтынг "Legatum Prosperity Index". Беларусь займае ў ім 78-е месца.

Рэйтынг грунтуецца на двух асноўных паказчыках — эканамічнай канкурэнтаздольнасці і якасці ўмоў для пражывання.

Самай квітнеючай краінай свету прызнана Аўстралія. У дзесятку найлепшых таксама ўвайшлі Нямеччына, Сінгапур і ЗША, Швейцарыя, Ганконг, а таксама Данія і Новая Зеландыя.

Першае месца ў катэгорыі краін з найболей канкурэнтаздольнай эканомікай заняў Сінгапур, а ў катэгорыі дзяржаў з лепшымі ўмовамі для жыцця — Нарвегія.

Віктар Юшчанка будзе развіваць беларускую мову

Ва ўкраінскіх універсітэтах будуць адкрывацца кафедры беларускай мовы. Пра гэта паведаміў Віктар Юшчанка пасля сустрэчы з А.Лукашэнкам у Гомелі.

Украінскі прэзідэнт заявіў, што ў 2009 годзе неабходна адкрыць кафедру беларускай мовы ў адным з універсітэтаў Украіны.

У Беларусь не пусцілі студэнтку беларусістыкі Варшаўскага універсітэта

Напрыканцы красавіка беларускія памежнікі адмовілі ва ўездзе ў краіну студэнтцы кафедры беларусістыкі Варшаўскага універсітэта Марце Шыманьскай. У грамадзянкі Польшчы была анулявана шматразовая беларуская віза і пастаўлена пячатка "Ва ўездзе забаронена", паведаміла "Польскае радыё".

Марта Шыманьска вучылася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце па праграме абмену паміж Варшаўскім універсітэтам і БДУ. У Мінск яна прыехала па запрашэнні БДУ ў сярэдзіне лютага. У беларускай сталіцы дзяўчына збірала матэрыялы для сваёй дыпломнай работы, прысвечанай надпісам на помніках на беларускіх могілках, у прыватнасці, аб'ектам яе зацікаўленасці былі Кальварыйскія могілкі.

28 красавіка на польска-беларускай мяжы памежнікі заявілі Шыманьскай, што яна нібы знаходзіцца ў нейкім спісе і ў сувязі з гэтым не можа наведваць Беларусь. За тлумачэннямі памежнікі параілі звярнуцца ў беларускую амбасаду ў Варшаве. У дыпламатычнай місіі Беларусі студэнтцы адмовілі патлумачыць прычыну забароны ўезду ў Беларусь.

Сама дзяўчына не разумее, чаму яе раптам унеслі ў "чорны спіс". "Я не займаюся палітычнай дзейнасцю ні ў Польшчы, ні ў Беларусі. Нават не падазраю, што я магла такога зрабіць, каб мне забаранілі ўязджаць у Беларусь. Я вельмі часта ездзіла ў Беларусь і ніколі не крытыкавала яе. Я маю такі прынцып: калі я кудысьці еду, я ніколі не кажу дрэнна пра гэтую краіну", — тлумачыць Марта Шыманьска.

Праграма абмену павінна была завяршыцца ў ліпені. Шыманьска вельмі хацела б завяршыць сваё навучанне ў Беларусі. Сваю дыпломную работу яна пісала на падставе беларускіх матэрыялаў. Цяпер вымушана змяніць тэму і пачынаць усё спачатку. Студэнтка вельмі шкадуе, што не зможа больш наведаць Беларусь. Беларусы Варшавы ведаюць Марту Шыманьску як вялікага аматара беларускай культуры і мовы. Яна неаднаразова брала актыўны ўдзел у арганізацыі ў польскай сталіцы беларускіх фестываляў, выступаў пісьменнікаў, музыкаў і мастакоў з Беларусі. Шыманьска з'яўляецца таксама сябрам навуковага кола "Albaruthenica" пры кафедры беларусістыкі Варшаўскага універсітэта.

В ожидании «Дожинок» Кобрин не будет мыться три месяца

Практически весь райцентр останется без горячего водоснабжения почти на квартал. Начальник котельного хозяйства КУМПП ЖКХ "Кобринское ЖКХ" Николай Ильясюк сказал, что иначе нельзя, потому что перед "Дожинками" нужно привести в порядок улицы, сообщают "Белорусские региональные новости".

В городе планируется освоить 330 миллиардов рублей. В частности, построить аквапарк и ледовый дворец. И сделать туалеты в старых домах на центральных улицах города — там, где жители до сих пор пользуются "скворечниками" на улицах.

ВІТАЕМ!

Ала Пугачова прыехала ў Мінск разам з Максімам Галкіным

Прымадонна расійскай эстрады ўчора зранку разам з Максімам Галкіным прыехала ў Мінск у сваім спецвагоне, прычэпленым да фірменнага поезда №1 "Москва—Минск".

Як стала вядома "Народнай Волі", пасялілася яна ў прэзідэнцкім нумары гатэля "Мінск", які спецыяльна да яе прыезду быў адрамантаваны.

"*Літаральна за дзень да яе прыезду мы скончылі рэстаўрацыю прэзідэнцкага нумара*, — распавяла "Народнай Волі" Вольга Трухан. — *Ала Барысаўна нумар нават не пазнала, хоць чатыры гады таму жыла ў ім*!"

Да гатэля "Мінск" Прымадонна з Галкіным пад'ехалі на "Мерседэсе". **Ала Пугачова** была з букетам белых руж. Сустракаўшыя спявачку на вакзале і каля гатэля прыхільнікі і журналісты адзначылі, што выглядае яна выдатна. Таго ж меркавання прытрымліваліся і тыя, хто меў непасрэдныя стасункі са спявачкай.

"*Яна выдатна выглядае — маладая, здаровая, энергічная*, — адзначыла намеснік дырэктара гатэля "Мінск" **Вольга Трухан**.

Засяліўшыся ў гатэль, Пугачова адразу замовіла каву з лімонам і папрасіла яе не турбаваць. Супрацоўнікі гатэля паведамілі, што перад канцэртам Ала Барысаўна мела намер з'ездзіць у Дудуткі.

Варта адзначыць, што ўсе квіткі на канцэрт Алы Пугачовай у Палацы спорту былі раскуплены проста імгненна. Публіку не засмуціла нават тое, што кошт на некаторыя з іх дасягаў 600 тысяч рублёў.

Дробязі

VIP-НУМАР

Прэзідэнцкі нумар (VIP Suite) у гатэлі "Мінск" каштуе больш за 1000 доляраў за суткі.

Гэта пяціпакаёвы нумар з дзвюма асобнымі спальнямі, шыкоўнай гасцінай з вялізным тэлевізарам, кабінетам, кухняй і пярэднім пакоем. У кожнай са спальняў ёсць свой санвузел з джакузі, а ў адным з іх — нават саўна.

"*Нездарма ён называецца прэзідэнцкім — гэта лепшы нумар у нашым гатэлі*, — адзначае намеснік дырэктара гатэля "Мінск" Вольга Трухан. — *А пасля рамонту ён стаў самым лепшым у горадзе*".

VIP-ВАГОН

Персанальны спецвагон Ала Барысаўна Пугачова атрымала ва ўласнае распараджэнне яшчэ восем гадоў таму. Яна арандавала ў Расійскай чыгункі навароччаны VIP-вагон. У ім ёсць спецыяльнае купэ для зоркі, чатырохмеснае купэ для яе супрацоўнікаў, купэ для прыёмаў са сталом на 8 персон і кухня. У асабістым купэ Прымадонны, апроч ложка, пісьмовага стала і шафы, усталяваны і тэлевізар з DVD. На кухні — халадзільнік і электрапліта. Стравы для спявачкі рыхтуюць таксама ў вагоне. Паслугамі рэстарана зорная дзіва карыстаецца вельмі рэдка.

Падчас шляху Прымадонна звычайна не выходзіць з вагона. Вокны заўсёды зашторany, а дзверы зачынены наглуха, так што пракрасціся да Пугачовай складана. Па прыездзе Алы Барысаўны яе спецвагон адпраўляюць на запасныя пуці.

Валерыя ЕСІНА.

С МОЕЙ КОЛОКОЛЬНИ

Утомление китчем

Давно хочу порассуждать на одну деликатную тему... Замахнуться, так сказать, на святое — наши традиции. Они у нас под своеобразным табу. Это правильно. Только всё ли, идущее с гущи масс, идеально, красиво, полезно для повторения? Народ всегда прав? Возможно. А народные массы? Лично я хочу поспорить. Народные массы — это толпа, она сильна, верно. Притяжения в ней больше, но — не права... Тогда всем ли обычаям надо слепо подражать, следовать? Нет ли в навязанных друг другу правилах своеобразной ловушки, элементарного массового гипноза? Понимаю, что сейчас буду находиться в позиции человека, пытающегося остановить руками ветер. И все-таки...

"Я взглянул окрест себя, и душа моя уязвлена стала..." Множатся и множатся вдоль наших загородных шоссе памятники с веночками, крестиками — погибшим в автомобильных катастрофах. Их могилы, естественно, на кладбищах, а вдоль автострад по всей стране стоят только знаки трагедий: маленькие столбики с крестиками и искусственными цветами — если по правде, так кто во что горазд. Между прочим, традиция эта из новообретенных, ей, по-моему, лет 25—30 от силы, не больше. Конечно, не приведи Господи... Но на дороге Минск — Молодечно таких знаков смерти, наверное, около сотни уже будет, что называется, на каждом километре. Какой-то настоящий адов коридор... Едешь и ежишься: сколько человеческих жизней вне срока здесь оборвано, сколько слез, горя человеческого. Да, momento mori. Да... А купила ли я майонез для шашлыка? А еще надо не забыть позвонить риэлтеру, отменить встречу... Кризис, свиной грипп, деньги на отпуск... И не замечаешь, как пафос в сознании вдруг сменяется усталостью, а то и житейской досадой: что это за китайские безвкусные цветы по обочинам? И почему так назойливо этим импортным винилом тебе напоминают о чьей-то смерти? Что-то вдруг отчаянно в тебе начинает протестовать. Глаза не хотят фиксировать знаки трагедий, мозг уводит сознание в ежедневные мирские заботы. А почему? Нарушено основное правило жизни: всему — и памяти о смерти — свое место. Есть кладбища, погосты, курганы — вот это земля для мертвых. Остальное принадлежит живым. Еще законами древнегреческой трагедии выведено: смерть — это кульминация, это точка наивысшего напряжения, но за ней обязательно следует развязка. Но вдоль шоссе развязки нет! На новом километре — новый лимонно-розовый венок. Что за реквием на одной ноте? И тогда вдруг твое напряжение само идет на убыль. Место трагедии в душе занимает... быт. Обыкновенный пошлый быт. Жизнь берет свое! И — слава Богу. Но тогда замечаешь уже то, что к трагической теме и не относится, но лезет, лезет в глаза: какие безвкусные цветы, какие кричащие краски... Китч, обыкновенный китч. И как быстро он распространился, и какой дешевый отпечаток привнес в том числе и в ландшафт нашего сознания, по-моему...

Вообще, давно пора задуматься о более пристойном оформлении и наших кладбищ, и отеческих могил. Да и об оформлении, если так можно выразиться, нашего поведения на погосте. Веками отработан строгий ритуал и погребения, и поминовения. Главное смысловое слово здесь "строгий". Так вот мы, по-моему, отчаянно его нарушаем. Нами вдруг овладела какая-то непристойная активность, маргинальная помпезность. То, что ежегодно происходит на наших кладбищах на Радуницу, — это безудержное столование, эта еда-питье без меры на могилах — тоже не что иное, как китч (что с немецкого переводится, как халтура, безвкусица). "Ты что, хочешь с народными традициями поспорить?!" Я хочу поспорить с массовой нелепой модой и вернуться к чистым традициям, без современного попсового налета, без этой внешней аффектации, которые привнесла во многие старые обычаи современная массовая культура. Действительно, существует традиция на Радуницу накрывать могилу чистой белой скатертью, класть на нее крашеные яйца, хлеб, лук, простые и важные элементы — символы! — народной жизни. Да, существует красивый обычай: молча посидеть у родного холмика, чтобы сосредоточиться, мыслью вернуться к корням, истокам своего рода, порадеть (все однокоренные слова с Радуницей!) об ушедших близких. Но обычай, кажется, трансформировался, и не в лучшую сторону. То, что я, например, видела в этот день на кладбищах маленького белорусского городка Чаусы, напоминало больше народную маевку, а не день поминовения близких. Наверняка так было повсюду в нашей стране: прямо-таки "чертог сиял, гремели хоры..." На могилах стояли салаты оливье, селедка под шубой и так далее по полному праздничному списку наших хозяек. Плюс серьезные горячительные напитки... Вечером многие не могли ровно пройти между оградами. Не удивлюсь, если кое-кто под ними свалился и спал... И это тоже с гущи народной традиции?

По-моему, на наших глазах идет настоящее вырождение ритуалов. (Впрочем, только ли их?) И пора об этом говорить вслух, без ложного страха перед "святыми обычаями", на которых налет дурновкусия величиной с арбуз. Попса добралась и до наших погостов. Именно так. И вместо очищения от соприкосновения с тайной смерти, вместо тех чувств, в которых "обретает сердце пищу", наступает утомление. Утомление китчем. Как будто на большом базаре побывал...

Елена МОЛОЧКО.

У Літву — па бясплатнай візе

Вырашылася пытанне з бясплатнымі візамі на фестываль Be2gether, што пройдзе побач з беларуска-літоўскай мяжой 12—14 чэрвеня. Беларусы, якія набудуць квіток на фестываль, змогуць атрымаць у амбасадзе Літвы ў Мінску бясплатныя візы для паездкі ў Літву.

Арганізатары фестывалю ў Нарвілішках кажуць, што зацікаўлены ў тым, каб прывабіць як мага больш гледачоў з Беларусі. Арганізатар фэсту **Гедрус Клімкявічус** здолеў дамовіцца з амбасадай Літвы ў Беларусі на выдачу бясплатных віз на паездку ў Літву. Іх змогуць атрымаць тыя, хто набудзе афіцыйны квіток на тры дні фэсту Be2gether.

Квіткі хутка паступяць у продаж у Мінску і будуць каштаваць 142 тысячы рублёў на тры дні фестывалю.

Колькі каштуе Вечны агонь?

У рэгіёнах Вечныя агні пераводзяць на антыкрызісны рэжым працы.

Так, у Камянцы каля брацкай магілы савецкіх воінаў не гарыць Вечны агонь. Па словах начальніка аддзела ідэалагічнай работы Камянецкага райвыканкама **Ірыны НІГЕРЫШ**, падчас эканамічнага крызісу трэба лічыць капейку.

Вечны агонь у Брэсцкай крэпасці абыходзіцца штомесяц у 5 тысяч долараў. Раней яго ўтрыманне забяспечваў "Газпром". Аднак сёлета, па словах дырэктара комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" **Валерыя ГУБАРЭНКІ**, падобная дамова пакуль не падпісана.

Вечны агонь на плошчы Перамогі ў Мінску абыходзіцца Цэнтральнаму раёну сталіцы прыкладна ў 4 мільёны 740 тысяч рублёў. Як адзначыла намеснік начальніка службы ўліку і метэаралагічнага забеспячэння Мінгазу **Раіса МІРАНОВІЧ**, Мінгаз прадае яго адміністрацыі Цэнтральнага раёна па тым жа кошце, што і ўсім іншым прадпрыемствам.

Ды наогул у Мінску шмат Вечных агнёў, якія не гараць увесь час, а толькі ўключаюцца на святы.

ВОЛНУЮЩАЯ ТЕМА

АЭС — фабрика по производству радиоактивных отходов

В предыдущей моей публикации ("Народная Воля" за 3.02.2009) мы с вами, уважаемые читатели, подробно рассмотрели, что собой представляет топливо для атомной станции. Сейчас давайте попробуем разобраться, что такое отходы ядерного топливного цикла. Ведь, как известно, кроме электричества атомная станция производит весьма специфическую продукцию — радиоактивные отходы, проблема утилизации и захоронения которых не решена нигде в мире.

Хранилища отходов не менее опасны, чем сама АЭС

Реактор АЭС интенсивно производит облученное ядерное топливо (ОЯТ). Его еще называют отработанным ядерным топливом, что в принципе неверно, так как оно продолжает *"работать"* еще сотни тысяч, а то и миллионы лет, выделяя тепло и радиоактивность. При функционировании реактора типа ВВЭР, который в теории может появиться на нашей земле, отходы нарабатываются весьма активно: около 25 тонн очень радиоактивных твердых отходов и 100 тысяч кубометров менее опасных жидких ежегодно. По два с половиной грамма и 10 литров на душу каждого белоруса!

Суммарная радиоактивность *"свежего"* топлива с трехпроцентным обогащением по урану-235 после года эксплуатации увеличивается в 100 миллионов раз! А топливо в активной зоне реактора облучается от двух до семи лет. По сравнению со *"свежим"* топливом ОЯТ содержит меньше урана-235 (он "выгорает"), зато накапливаются изотопы плутония, другие трансурановые элементы, а также осколки, или продукты деления — ядра средних масс. Период полураспада некоторых из них исчисляется миллионами лет! С течением времени изменяются также и физические характеристики конструкционных материалов тепловыделяющих сборок (ТВС). В определенный момент они становятся функционально непригодными (попросту "дырявыми") для нормальной работы реактора и подлежат удалению из него.

Облученные сборки перемещают из активной зоны реактора во временное пристанционное хранилище с помощью специальной перегрузочной машины. Тепловыделяющие сборки слишком радиоактивны, чтобы их можно было куда-то везти. Около реактора размещают бассейны с водой, где ТВС и "остужают". Происходит химическая обработка, которая также сопровождается появлением дополнительных отходов. После 3—8 лет такой выдержки становится возможным их вывоз с площадки АЭС. При этом необходимо вентилировать бассейн, чтобы исключить накопление газов, в том числе и образование взрывоопасного гремучего газа, постоянно очищать воду от радиоактивных загрязнений, появляющихся из-за негерметичности побывавших в реакторе ТВС. Воду очищают также от следов коррозии конструкционных материалов. Есть еще ряд проблем, с которыми придется столкнуться, если АЭС заработает и начнет производить десятки и тысячи тонн радиоактивных отходов. Ради их решения бассейны выдержки превращаются в сложные технологические установки. Сложные и опасные.

Аварии, связанные с облученным ядерным топливом, происходят регулярно. Так, 10 апреля 2003 года в хранилище тепловыделяющих сборок на атомной электростанции Пакш, расположенной южнее Будапешта, произошла авария, которая при неблагоприятном развитии могла привести к ядерному взрыву. 30 тепловыделяющих сборок (около десятой части всей загрузки реактора) после процесса химической очистки хранились в стальном бассейне. В результате ошибок операторов стержни перегрелись, вода выкипела, температура поднялась до 1200 градусов, выделившийся радиоактивный газ заставил персонал спасаться бегством. Пустили на раскаленные стержни воду — они рассыпались, и на дне образовалась радиоактивная масса. Будапешт спасло только чудо. Последствия аварии преодолевали несколько лет и завершили восстановительные работы лишь год назад.

Самая серьезная авария, связанная с хранением отходов, известная как "кыштымский взрыв", произошла в СССР. В сентябре 1957 года на комбинате "Маяк" (Озерск, Челябинская область) взорвался резервуар с радиоактивными отходами. Прошел выброс радиации объемом 20 миллионов кюри, что всего лишь в два с половиной раза меньше, чем во время Чернобыльской катастрофы. Естественно, и взрыв, и его последствия были засекречены. Сегодня трудно установить, сколько людей тогда пострадало. Последствия взрыва не преодолены до сих пор. Мне приходилось бывать на месте его эпицентра. И спустя полвека там нельзя находиться дольше нескольких минут даже в защитной одежде.

Транспортировка опасна и недешева

Нам обещают, что накопленные радиоактивные отходы будет забирать поставщик топлива. Предположим, это так. Но операция транспортировки опасна, как и все остальное, что связано с АЭС. Только в США в 1971—1981 годах произошло 108 аварий при перевозке радиоактивных веществ, в том числе отходов. После атаки на нью-йоркские небоскребы в 2001 году любая транспортировка отходов по стране была запрещена как *"крайне опасная операция с точки зрения физической защиты ядерных материалов от несанкционированного доступа"*.

Летом 2008 года сотрудники находящегося под опекой государства Института национальной памяти опубликовали книгу, в которой говорится, что в 1970-х годах Валенса сотрудничал со спецслужбами социалистической Польши. В 1990 году он, заняв пост президента страны, якобы забрал из архивов уличающие его документы. Еще до официального выхода книги Лех Качиньский в телеинтервью заявил, что выводы историков о прошлом Валенсы являются правдивыми.

Валенса требует, чтобы суд обязал власти извиниться и выплатить ему моральную компенсацию в размере 100 тысяч злотых (30,7 тысячи долларов). Ранее бывший президент пообещал вернуть Польше все свои награды и покинуть страну, если авторов книги не накажут.

В 1980-х годах Лех Валенса вошел в число основателей профсоюза "Солидарность". Он сыграл важную роль в выводе Польши из-под влияния СССР. В 1983 году Валенсе вручили Нобелевскую премию мира. Президентом Польши он был в 1990—1993 годах.

Тысячи бразильцев бегут от наводнений

В результате наводнения и оползней, вызванных многомесячными проливными дождями, на севере Бразилии погибли люди. Около 200 тысяч человек покинули свои затопленные дома, сообщает "Ассошиэйтед Пресс". Затопленными оказались сотни километров дорог, со многими районами прервано железнодорожное сообщение, блокирована работа горно-добывающих и других промышленных предприятий. Власти страны оказывают помощь пострадавшим, развернуты лагеря для беженцев.

Метеорологи предсказывают, что в ближайшие две недели дожди на севере Бразилии не прекратятся. В прошлом году в результате наводнений и оползней на юге страны погибли около 100 человек, без крова остались более 80 тысяч, отмечены многочисленные случаи мародерства, поскольку отчаявшиеся люди готовы были идти на преступления в поисках воды и пищи.

АЎТАБІЯГРАФІЧНАЯ АПОВЕСЦЬ

Васіль ШАРАНГОВІЧ

ГЕН ЖЫЦЦЯ

(Працяг. Пачатак у №№57—68.)



І вось пачаліся экзамены. Першы — малюнак гіпсавай архітэктурнай разеткі. Я маляваў, як мог, а гэта значыць гладзенька тушаваў, старанна перадаючы святлацені. У час перапынкаў хадзіў па радах, а зала была вялікая і было лёгка назіраць, як малююць астатнія. І што ж? Я тушую, не дапускаючы ніякіх вольнасцей, вельмі акуратна гэта раблю, а яны ўсе малююць штрыхом. Зноў у мяне атрымліваецца не так, як у іншых. Ды я ніколі і не бачыў, як малююць штрыхом. Падумаў і вырашыў, што другі малюнак буду таксама штрыхаваць, а цяпер уважліва вывучаў, як гэта робяць іншыя паступаючыя.

У той час уступныя экзамены складаліся наступным чынам: малюнак гіпсавай разеткі і нацюрморт, акварэллю пісалі нацюрморт з чучалам птушкі і нацюрморт з прадметаў, дзе, як правіла, асноўным быў жбан. Пасля пісалі дыктант і здавалі вусны экзамен па гісторыі СССР. Прымалі ў вучылішча як сямікласнікаў, так і дзесяцікласнікаў. Але агульнаадукацыйныя экзамены ўсе здавалі за сем класаў.

Першы малюнак я зрабіў, як мог, а вось другі пачаў штрыхаваць, пастаянна праходжваючыся за спінамі іншых паступаючых і на хаду вывучаючы, як гэта робіцца. І мне здавалася, што ў мяне атрымоўваецца не горш, чым у астатніх. Але раптам з'явіўся на экзамены дырэктар (Іван Рыгоравіч Краснеўскі) з нейкім здаравенным, з чорнымі вусамі, дзядзькам. Праходзячы, яны прыпыніліся за маёй спінай, і гэты невядомы мне дзядзька (а гэта быў Альгерд Адамавіч Малішэўскі) гаворыць дырэктару: "Во, хлопец сена-салому робіць". Я, пачуўшы гэтыя словы, адразу ўцяміў, што ў мяне нешта не так выходзіць. Калі яны адышліся, я кінуўся глядзець малюнкі іншых прэтэндэнтаў (слова "абітурыент" тады, мне здаецца, не існавала), і мне зноў падалося, што ў мяне атрымоўваецца гэтак жа, як і ў іх. Але трывога не пакідала душу.

Адначасова з малюнкамі мы пісалі нацюрморты акварэллю, некаторыя — алеем. Тут я сябе адчуваў больш упэўнена і не звяртаў ні на каго ўвагі. Пасля прагляду нашых работ экзаменацыйная камісія выставіла мне за першы малюнак "чатыры", за другі — "тры", за абедзве акварэлі па "чацвёрцы". Пісаць дыктант і здаваць гісторыю СССР мне было не трэба, бо я на "выдатна" закончыў сем класаў, і мяне адправілі дадому чакаць вынікаў конкурсу.

Але я адразу чамусьці быў упэўнены, што мяне не прымуць. Для мяне ў школе адзнакі "тры" наогул не існавала, ды і "чацвёрку" я не лічыў надта вялікай адзнакай. У рэшце рэшт так яно і выйшла — я атрымаў паведамленне, што не прайшоў па конкурсе.

І што, вы думаеце, мяне гэта надта засмуціла? У мяне апусціліся рукі? А нічколькі, наадварот, я ўпэўніўся, што змагу паступіць у вучылішча, толькі трэба многа працаваць. З'явіўся ўнутраны ўздым, вялікае жаданне стаць мастаком, і толькі пасля праваленых экзаменаў у вучылішча я адчуў, што з выбранай жыццёвай дарогі ніколі не збочу.

Наведванне Мінска, карціннай галерэі, салона-магазіна, здача экзаменаў у вучылішча адкрылі ў маім дзіцячым уяўленні многа новага, дасюль невядомага, гарызонт як бы пашырыўся, у мяне раскрыліся вочы. З зайздроснай апантанасцю яшчэ летам я накінуўся на работу з натуры. Маляваў і пісаў усё, што пад руку трапляла, без аніякай сістэмы і метадалогіі. Як бы адводзіў душу.

* * *

Хутка пачаліся заняткі ў мядзельскай школе, і я зноў сустрэўся з Генадзем Астроўскім, які ўжо ведаў пра мой правал. Ён таксама нічколькі не засмуціўся, а нават узрадаваўся, што не страціў напарніка і, можна сказаць, калегу. А я быў абсалютна ўпэўнены, што буду паступаць у вучылішча на наступны год і абавязкова паступлю. Можа, гэта была і самаўпэўненасць, а можа, сапраўдная вера ў сваю зорку, у сваё, наканаванае лёсам, прызначэнне.

Матэрыяльнае становішча нічколькі не палепшылася, але гэта акалічнасць мяне зусім не цікавіла. Заняткі мастацтвам паглынулі маю істоту цалкам. Урокі, як і ў восьмым класе, практычна дома не рыхтаваліся, усё рабілася на хаду. Тым не менш дзявяты клас закончыў з выдатнымі адзнакамі па ўсіх прадметах, акрамя нямецкай мовы.

Як і раней, малявалі і пісалі з Генадзем Астроўскім нацюрморты, пейзажы, асобныя дрэвы, хаты. Удваіх ганарліва хадзілі па Мядзеле з альбомамі, а потым недзе прысаджваліся і пачыналі маляваць. Нас абступалі местачкоўцы, з імі пачынаў дыскусію Генадзь Ігнатавіч, выдумляў нешта смешнае, а то і гаварыў проста несусвецiцу, і яму, як ні дзіўна, верылі. Часам я нават папракаў настаўніка: як ён можа людзей так уводзіць у зман? Але бакі разыходзіліся задаволенымі, і мы, зрабіўшы накід, шыбавалі далей. З таго часу я не любіў, калі падчас работы ў мяне нехта стаіць за спінай, хай сабе і выкладчык. Таксама, як пасля таго злашчаснага малюнка штрыхом я амаль што не карыстаўся штрыхавой манерай.

Я ўжо ўпамінаў, што Генадзь Астроўскі пры наведванні намі Мінска накупіў алейных фарбаў і пэндзляў. З натуры мы пісалі толькі акварэллю. Але неяк Генадзь Ігнатавіч прапанаваў паспрабаваць пісаць алейнымі фарбамі і зрабіць копіі з рэпрадукцый. А рэпрадукцыі былі зноў-такі толькі ў часопісе "Огонёк". Ён выбраў для копіі "Залатую восень" І. Левітана, а я "Адлігу" Ф. Васільева. Мой бацька змайстраваў нам падрамнікі памерам больш за метр па вялікім боку, маці дала суровага палатна, якое мы загрунтавалі па рэцэпту Генадзя Ігнатавіча, бо я не ведаў, як гэта робіцца. Зрабілі палітры, і работа пайшла. Яна доўжылася больш за месяц. Тая мая копія вісела ў бацькоўскай хаце ў Качанах, потым у Латвіі і ў Мінску, калі яны пераехалі сюды жыць. Я ўжо не раз бачыў арыгінал "Адлігі", але, гледзячы на сваю работу, здзіўляюся, як гэта я змог так зрабіць копію, упершыню ўзяўшыся за алейныя фарбы.

Трэба сказаць, што партрэтаў мы не малявалі і не пісалі. Копій больш таксама не рабілі, хаця гэта так характэрна для пачаткоўцаў. Мне часта даводзілася і даводзіцца разглядаць іх работы, і я заўсёды кажу, што трэба спачатку навучыцца добра маляваць прадметы і толькі потым спрабаваць маляваць жывую натуру. Пра гэта ж мне гаварыў Генадзь Астроўскі, ды мы так і рабілі.

Аднойчы дырэктар школы М. Яфрэменка папрасіў Генадзя Астроўскага зрабіць для школы партрэт Г. Малянкова, які прыйшоў тады да ўлады ў Савецкім Саюзе. Той узяўся за работу. Партрэт быў вялікі, і я дапамагаў настаўніку: твар пісаў сам Генадзь Ігнатавіч, а зялёны кіцель з гузікамі і фон пісаў я. Партрэт настаўнікам школы і дырэктару спадабаўся, але які ён атрымаўся на самай справе, цяпер мне цяжка ацаніць.

Вучоба ў школе ішла тым жа руцінным шляхам. Як і заўсёды, я сядзеў на "камчатцы", мог учыніць нейкую хохму аднакласнікам ці настаўнікам, асабліва першага красавіка. Ужо тады гэты дзень лічыўся днём смеху. Усе баяліся настаўнікаў, а для мяне гэта пачуццё не было характэрна. Таму толькі я адзін з класа мог нешта прыдумаць і пажартаваць з таго ці іншага настаўніка. Я заўсёды вывучаў, як паводзяць сябе на ўроках выкладчыкі, якія ў іх звычкі, і адпаведна дзейнічаў. Напрыклад, гісторык Рувім Альпяровіч, як правіла, садзіўся за стол, вучань пры адказе стаяў за ім бліжэй да школьнай дошкі, і ён ніколі не паварочваўся да вучня, а глядзеў на клас. І вось аднойчы ён выклікаў мяне для адказу. Я захапіў з сабой падручнік з загорнутай старонкай, бо нічога з зададзенага ўрока папярэдне не чытаў, і, стоячы за спінай настаўніка, зачытаў з кніжкі заданне слова ў слова, пад хіхіканне вучняў. Рувім Альпяровіч, задаволены адказам, паставіў "пяцёрку", а я, зноў схаваўшы падручнік, сеў на сваё месца.

Настаўнік геаграфіі Яраслаў Звяруга, тагачасны загадчык райана, меў такую моду. Калі ён сёння выклікаў вучня да дошкі для адказу на заданне, то на наступным уроку выкліча абавязкова зноў, бо добра ведаў звычку настаўнікаў некалькі ўрокаў не выклікаць да дошкі ўжо апытаных вучняў, а яны гэтым карысталіся і не рыхтаваліся да іх.

Валянціна Іванаўна Шашок была ўпэўнена ў маім таленце матэматыка і ніколі мяне асабліва не правярала. Вось ідзе ўрок матэматыкі, я заняты нечым іншым, а яна мне робіць заўвагу. Я падымаю галаву, гляджу на дошку, дзе яна рашала задачу, і бачу, што рашэнне задачы няправільнае. Нічога не гаворачы, я ўстаю, дэманстратыўна іду да дошкі, сціраю напісанае і правільна рашаю задачу. Валянціна Іванаўна гаворыць класу, што яна памылілася, мне ставіць "двойку" і выганяе з урока. Дарэчы, гэта была мая першая і апошняя "двойка", хаця і за чвэрць, і за год яна выставіла мне "пяць".

У Мядзельскай сярэдняй школе ў той час усіх класаў было па два — адзін з беларускай мовай навучання, другі з рускай. У беларускіх класах былі вучні з навакольных вёсак, у рускіх — дзеці мядзельскага начальства, дзеці прыезджых, як правіла рускіх, і іншых дробных клеркаў. Памятаю дзяцей сакратароў райкама (прозвішчы іх забыліся), сыноў старшыні райвыканкама Міцкевіча. Яны ўсе хадзілі разам, вучыліся дрэнна, але затое добра гулялі ў валейбол, футбол і аддавалі гэтаму занятку ўвесь свой вольны час. Наколькі ведаю, нічога людскага з іх не атрымалася, ды і што магло атрымацца, калі яны вучыліся з "тройкі" на "двойку", і то з дапамогай бацькоўскага аўтарытэту. А якія бугаі былі ў параўнанні са мной, шчуплым вясковым хлопцам.

Адпаведна і настаўнікі ў паралельных класах былі розныя, але некаторыя выкладалі і ў тых, і ў другіх. Тады мне ў галаву не прыходзіла, што з цягам часу Мядзельская школа стане цалкам рускай, хаця настаўнікі, маючы на ўвазе старэйшыя, не развучыліся гаварыць па-беларуску. Балюча адбілася на маім сэрцы запрашэнне на апошні юбілей школы. Калі раней такія запрашэнні прыходзілі на беларускай мове, то апошняе — на рускай. Я ўпершыню на яго і не паехаў. Русіфікацыя дакацілася і да нашага краю, дзе вёска заўжды гаварыла, ды і цяпер гаворыць, на сапраўднай беларускай мове.

Пасля гэтага невялікага адступлення вяртаемся ў тыя 50-я гады.

У дзевятым класе выкладчыкам нямецкай мовы ў нас стаў Канстанцін Дудак. Гэта быў маёр контрразведкі, былы рэзідэнт у Германіі, які, казалі, пасля вайны быў звольнены за п'янства і частую змену жонак. У Мядзел ён з'явіўся ўжо з чацвёртай ці пятай жонкай. Быў задзірысты і няўжыўчывы чалавек, ганарлівы і самалюбівы. З Генадзем Астроўскім у яго адразу склаліся напружаныя адносіны, бывалі даволі частымі сутычкі, але той умеў даць здачы за любую абразу.

Зразумела, Канстанцін Дудак выдатна валодаў нямецкай мовай. Аднак ставіўся ён да вучняў груба, і ў залежнасці ад таго, колькі перад урокамі выпіў. Любіў гаварыць, што ў школе толькі ён ведае нямецкую мову на "пяць", Шаранговіч ведае на "чатыры", астатнія вучні — на "тры" і "два". Такімі адзнакі і былі, і я ўпершыню за дзевяць гадоў навучання займеў адну выніковую адзнаку "чатыры" — менавіта па нямецкай мове.

Мы, тым не менш, змаглі арганізаваць К. Дудаку "падставу", якая адбылася на стары Новы год. Разам з аднакласнікамі позна ўвечары ў гэты святочны дзень высыпалі сажай дарожку, па старой звычцы, ад яго дома да дома мядзельскага пракурора. Што пасля гэтага было, цяжка і ўявіць сёння. Якія былі разборкі, высвятленне адносін! Нас жа ніхто западозрыць не мог. Але жарт падстроілі добры.

Разам з Генадзем Астроўскім у дзевятым класе давялося ўпершыню рабіць і так званую "халтуру". Ён браў заказы на напісанне лозунгаў да савецкіх святаў, на выраб агітацыйных шчытоў і плакатаў, шыльдаў на шкле для мядзельскіх устаноў і магазінаў. Так я прыдбаў навыкі напісання шрыфтоў. Памятаю, да свята песні на Нарачанскім узбярэжжы раённае начальства заказала нам, акрамя іншага, беларускі сцяг даўжынёй аж восем метраў. Мы намалявалі арнамент на вертыкальнай чырвонай паласе, але атрымалася загваздка: нідзе не было зялёнага палатна. Тады мы ўзялі ды самі пафарбавалі белае палатно ў зялёны колер. Кіпяцілі на вуліцы ў вялікім чане, і выйшла нядрэнна, сцяг зрабілі на славу. За нашу працу плацілі мізэрныя грошы, але і мне хоць троху перападала. Асноўнае рабіў Генадзь Ігнатавіч, я ж быў ягоным памагатым.

Неяк незаўважна, у турботах, у пастаяннай працы над малюнкамі і акварэльнымі эцюдамі закончыўся навучальны год, і я зноў падаў дакументы ў Мінскае мастацкае вучылішча. Тым больш што сабраў трохі грошай на дарогу.

* * *

З'явіўся на экзамены ў тым самым абмундзіраванні і з той самай пасцілкай, але больш упэўнены, чым летась. За год я многаму навучыўся, многае зразумеў. Пасялілі нас таксама, як і летась, у аўдыторыі вучэльні. Вечарам аднарукі хлопец з Брэста, а гэта быў Саша Краўчук, заявіў усім, што іх з Брэста прыехала шэсць чалавек і шэсць месцаў ужо занята. Ну і ну, думаю, месцаў жа не так многа, і няўжо зноў будзе няўдача. Забягаючы наперад, скажу, на самай справе паступілі з Брэста толькі два хлопцы — гэта Саша Краўчук і Пеця Свентахоўскі. Але ўсё па парадку.

(Працяг на 6-й стар.)

ГЕН ЖЫЦЦЯ

(Працяг. Пачатак на 5-й стар.)

На гэты раз, ні на каго не гледзячы, я маляваў і пісаў, як мог і як разумеў, яшчэ і дапамагаючы аднаму хлопцу з вёскі, па прозвішчу Андрэйчык, які прыладзіўся каля мяне. У выніку экзаменацыйная камісія выставіла мне за ўсе работы "пяцёркі", а агульнаадукацыйныя прадметы зноўтакі не трэба было здаваць, у залік ішлі таксама "пяцёркі". Дырэктар вучылішча Іван Рыгоравіч Красneўскі сказаў мне, што я магу ехаць дадому і рыхтавацца да прыезду на вучобу. Я і сам гэта разумеў, бо наўрад ці каму яшчэ ўдасца здаць экзамены на "выдатна". Так яно і атрымалася. Але рашэнне аб прыёме прыйшло пазней.

Не памятаю, ці радаваўся я такому павароту падзей, але было над чым прызадумацца. Інтэрната вучылішча не мела, трэба было здымаць прыватную кватэру, ды яшчэ аднаму шукаць яе ў незнаёмым вялікім горадзе. Ніхто з бацькоў не мог дапамагчы вырашыць гэта пытанне, бо за якія шышы паедзеш у Мінск, тут бы як-небудзь сына, хаця б аднаго, адправіць. Бацька і маці практычна нічога ў калгасе не атрымлівалі, у лепшым выпадку — сто грамаў гірсы на працадзень. Так называлася збожжа, у якім было больш зярнят ад пустазелля, чым самога збожжа, і прыдатнае яно было толькі на корм для жывёлы. Якая-небудзь капейчына заводзілася, калі штонебудзь прадавалі: авечку ці цяля. А тут яшчэ двое малых дзяцей, ды і хутка мама павінна была яшчэ аднаго нарадзіць. Я заўсёды быў і буду ўдзячны бацькам, якія падтрымлівалі мае намаганні, хоць гэта было і неверагодна цяжка. Самае галоўнае, хлеба не хапала, ды і купіць яго было цяжка. Па адным бохане чорнага і белага можна было купіць у Мядзеле, але туды трэба было дабрацца як мага раней і выстаяць доўгую чаргу. Трохі спазніўшыся, вернешся ні з чым. Дзеці рэдка калі бачылі цукар, не кажучы пра салодкія цукеркі-"падушачкі". Мужыкі, сабраўшы грошай, ездзілі ў Маладзечна і прывозілі адразу па мяху хлеба і трохі батонаў. Хлеб з цягам часу чарсцвеў, тады яго "адпякалі". Рабілася гэта так: бохан трохі змочвалі вадой і ставілі ў печ. Ён мякчэў, але можна ўявіць сабе, якім ён рабіўся на смак. І гэта было яшчэ вельмі добра, але асноўнай ежай зноў жа была бульба.

Бацька таксама збіраў грошы, каб з'ездзіць у Маладзечна. Аднаго разу ён з горада прывёз хлеба і батонаў. Батоны для ўсіх дзяцей былі вялікім святам. Мой малодшы брат Вячаслаў, які тады быў у трэцім ці чацвёртым класе, сцягнуў адзін батон і пайшоў з ім у школу. У перапынку паміж урокамі, разразаючы батон на кавалкі і раздаючы іх аднакласнікам, ён гаварыў вучням: маўляў, калі прыйдуць амерыканцы, то ўсе кожны дзень будуць есці такія батоны. Настаўнік пачуў такія разважанні брата і далажыў дырэктару, а той выклікаў бацьку ў школу, каб высветліць, чаму гэта дзяцей вучаць дома і аб чым там гавораць.

Ясна, брат пра амерыканцаў сам прыдумаць не мог, недзе, відаць, чуў — ці ад бацькоў, ці ад аднавяскоўцаў. Але ўдумаемся: брат лічыў, і іншыя дзеці таксама, найвялікшым шчасцем у жыцці магчымасць кожны дзень з'есці кавалак батона! Гэта як тая качаноўская Адэля, што марыла дажыць да таго дня, калі будзе есці дранікі, а тлушч будзе цячы аж па локцях (бліны ў вёсцы елі толькі рукамі). Можна ўявіць узровень вясковага жыцця, калі такія жаданні былі недасягальнай марай.

Я зрабіў гэта адступленне, каб даць магчымасць чытачу хоць крышачку адчуць, у якіх жыццёвых умовах мне давялося рыхтавацца да ад'езду з роднай вёскі, напэўна, назаўсёды пакідаючы любыя мясціны і дарагіх, блізкіх людзей. А яшчэ мяне страшылі чужына, невядомасць і адзінота.

Адзенне заставалася тое самае: сінія галіфэ, зялёны кіцель, вышываная кашуля (паркалёвая ў запас), боты і суконная тужурка. Але куды ж пакласці рэчы, не ехаць жа з той самай пасцілкай, хаця я і ўзяў яе замест коўдры.

Бацька ўзяўся рабіць чамаданскрынку. Тонкіх дошак тады не рэзалі, былі, як цяпер кажуць, трыццаткі і саракоўкі. Бацька з дапамогай сякеры і гэбля зрабіў іх тоненькімі (фанеры ж не было) і збіў чамадан, які і праслужыў мне ўсе гады вучобы. Праўда, быў ён не такі ўжо і лёгкі. Увесь няхітры скарб быў сабраны — кавалак сала, масла, трохі яек, сыр, адзежа — чамадан стаў зусім важкі. На дарогу бацькі далі сто рублёў, сказаўшы, што больш няма, ды і тыя пазычылі ў суседзяў.

Я адыходзіў ад сваіх бацькоў, ад усяго, што складала маё жыццё, мае радасці і нягоды. Бацька праводзіў да Заняў, адкуль павінна была ехаць фурманка да Мядзела, дзе мы развіталіся. Маці заставалася дома, гаротная, заплаканая, бо сын пакідае сваё гняздо, у якім яна яго песціла, вучыла розуму, жыццёвым панцыцям, дабрыні і душэўнасці. Што ж тады было ў яе на душы? Там, пэўна, раілася шмат пачуццяў, і ў першую чаргу страх і трывога за сына, за яго лёс і будучыню, бо ў жыцці мама ўспрымала ўсё балюча, як чалавек з абвостраным адчуваннем і тонкай душой. Мы з бацькам ішлі сцяжынкай да дарогі, а яна глядзела ўслед, ахапіўшы рукамі штакеціну плота, і не магла адарвацца ад яе да таго часу, пакуль мы не дайшлі да бярозы, ад якой яшчэ быў відаць наш дом. Яна развіталася з першынцам, а яшчэ аднаго насіла ў гэты час пад сэрцам. Што ж усіх нас чакае ў будучым, ніхто не ведаў.

А ў мяне ў гэты час сэрца агортвала туга, слёзы падпіралі вейкі, бо чула душа, што развітанне з роднай хатай, з нашай сялібай, ды і з сумесным жыццём з бацькамі — гэта надоўга, а можа, і назаўсёды.

Бацька, як заўсёды, не падаваў выгляду горкага развітання, а па дарозе ў Зані мне сказаў: "Калі нічога не атрымаецца, то вяртайся, будзем разам каваць у кузні". Бацька заўсёды лічыў мяне самым лепшым сваім памочнікам. А яшчэ ён дадаў словы, якія я запомніў на ўсё далейшае жыццё, і думаю, што прытрымліваўся гэтага наказу. Ён сказаў: "Вася, ты накіроўваешся ў вялікую дарогу, дык жыві з людзьмі і сярод людзей".

Доўгія студэнцкія гады

І вось са сваёй сотняй рублёў у кішэні і з "чамаданам", хоць і цяжкім, я дабраўся да Мінска. Стаў на вакзале і адразу засумаваў, страшнавата было на душы. Так многа народу — і ніводнага знаёмага твару! Усе чужыя. А што рабіць? Дзе шукаць кватэру? Шлях да Опернага тэатра я ведаў, а больш нічога. Дабраўшыся да Опернага, за Суворaўскім вучылішчам убачыў суцэльны прыватны сектар і пашыбаваў у той бок на пошукі кватэры. Пачаў з вуліцы Саўгаснай, якая потым на завароце пераходзіла ў Калгасную. Назвы вуліц да болю блізкія. Са сваімі клункамі я ішоў ад дома да дома, адкрываючы ці стукаючы ў веснічкі з адным і тым жа пытаннем: ці здаецца які куток для студэнта? Шмат дзе былі сабакі, і я баяўся туды заходзіць. Так безвынікова прахадзіў да вечара, недзе на лаўцы перакусіўшы са свайго запасу. Чамадан ужо адрываў рукі. Трэба ж неяк пераначаваць, каб заўтра ўсё пачаць наноў. Дабраўся зноў да вакзала і там на лаўцы для пасажыраў прабавіў ноч.

Назаўтра раніцай рушыў зноў да Опернага тэатра, каб прадоўжыць пошукі. Іншых месцаў, дзе можна шукаць жыллё, я не ведаў. Гэтым днём я прайшоў ад Старажоўкі ўсе прылеглыя вуліцы — і марна. Чым далей, тым больш маркотна, безнадзейна рабілася на душы, не бачылася выйсця. Усё часцей прыпаміналіся бацькавы словы: маўляў, калі нічога не атрымаецца, то прыязджай назад, будзем разам каваць у кузні. Родная вёска пачынала здавацца раем, дзе ўсе цябе ведаюць і ты таксама ўсіх ведаеш, ёсць з кім пагутарыць. А тут народу поўна, але адчуваеш сябе нейкім ваўком, што адбіўся ад зграі, чужым, нікому не патрэбным, нікчэмным чалавекам. Кузня з новай прыцягальнай сілай усплывала ў душы, здаючыся яшчэ больш мілай і блізкай з яе гарном, накавальняй, скуранымі раздзімнымі мяхамі, з пахам жалеза і феерверкам іскраў пры яго зварцы.

Аднак невялікая надзея яшчэ тлела. Зноў пераначаваўшы на вакзале, раніцай рашыў яшчэ раз паспрабаваць шчасця. Абхадзіўшы да абеду шмат дамоў усё ў тым жа раёне Опернага тэатра і нічога, як на злосць, не знайшоўшы, я канчаткова палічыў, што лёс адвярнуўся ад мяне і няма іншага выйсця, як вяртацца дахаты.

Я не сказаў, што прыехаў за тры дні да пачатку заняткаў у вучылішчы, з мэтаю ўладкавацца дзе-небудзь на кватэры. І вось апоўдні, пануры, разгублены, зломлены няўдачай, падышоў да Опернага тэатра, каб трошкі адпачыць і развітацца са сваёй марай. Прысеў на лаўку, дастаў кавалак сала і хлеба, каб падсілкавацца перад дарогай у свае Качаны. Настрой быў зусім кепскі, журбота сціскала сэрца.

Праз хуткі час убачыў каля дзвярэй вучылішча (а яны былі на адваротным баку ад параднага ўваходу ў тэатр) хлопца, якога заўважыў яшчэ пры паступленні, але не быў з ім знаёмы. Звярнуў на яго ўвагу таму, што яго знешнасць нагадвала татарскую або мангольскую: скулы на твары вельмі характэрныя, раскосыя вочы, трохі прыплясканы нос. Я падышоў да яго і спытаўся, ці не ён здаваў экзамены ў вучылішча. Так, гэта быў Толя Арцімовіч, які таксама паступіў. Ён расказаў, што прыехаў з Бабруйска разам з яшчэ адным бабруйскім хлопцам, Жорам Луканскім, знялі кватэру, але пакой разлічаны на траіх, дык ці не хацеў бы я да іх далучыцца?

Якое гэта было для мяне нечаканае шчасце! Я не тое што ад радасці, хутчэй ад неспадзяванкі ледзь не заплакаў, і мы хуценька накіраваліся на Саўгасную вуліцу, дзе мяне ўжо чакаў ложак з голымі дошкамі. Ад Толі я даведаўся пра яго прыгоды. Ён паступаў на жывапіснае аддзяленне, але не прайшоў па конкурсе, і яму прапанавалі вучыцца на аддзяленні скульптуры, на якое не было прэтэндэнтаў.

Пачаліся заняткі. У першы дзень нам паведамілі, што малюнкам і жывапісам мы будзем займацца на мансардах па вуліцы Даўгабродскай, недалёка ад плошчы Перамогі, агульнаадукацыйнымі прадметамі — у класах, якія месціліся ў будынку Опернага тэатра, як і адміністрацыя вучылішча. І яшчэ навіна — створаны дзве групы: адна з тых навучэнцаў, якія скончылі сем класаў, а другая — якія дзесяць. Агульнаадукацыйныя прадметы, такія як гісторыя мастацтва, перспектыва, анатомія, чарчэнне і архітэктура, усе будуць праходзіць разам, а прадметы за дзесяць класаў — толькі для тых, хто скончыў сямігодку. У цэлым усе будуць вучыцца пяць гадоў: і сямікласнікі, і дзесяцікласнікі. Але ўзнікла адна загваздка — я і Вася Ціханенка з Віцебска скончылі дзевяць класаў. Нам параілі пайсці ў дзесяты клас вячэрняй школы, і тады нас залічаць у групу дзесяцікласнікаў. Бліжэйшай ад таго месца, дзе я жыў, была дзевятая вячэрняя школа на Юбілейнай плошчы. Туды ж падаў заяву і Вася Ціханенка, хоць кватараваў вельмі далёка ад яе. Вучань у школе, мяркуючы па адзнаках, ён быў слабаваты і спадзяваўся на маю дапамогу.

Не ведаю, ці звычайнае супадзенне, ці нейкая наканаванасць, але потым у будынку дзевятай вячэрняй школы месцілася Рэспубліканская школа па музыцы і выяўленчаму мастацтву, цяпер Рэспубліканскі ліцэй імя І. Ахрэмчыка. Калі мастацкая школа займела асобны будынак, там была адкрыта сярэдняя школа № 26 з мастацкім ухілам, на базе якой мне разам з яе дырэктарам З. Паўлавай удалося адкрыць Мінскі гарадскі ліцэй пры Беларускай акадэміі мастацтваў (тады я быў яе рэктарам) і атрымаць новенькі будынак для яго па вуліцы Камуністычнай (былая Старажоўка). Памятаеце, якраз там я ў свой час беспаспяхова шукаў кватэру. (Намнога пазней былы кінатэатр "Беларусь" разам са скверам на Юбілейнай плошчы быў перададзены Музею сучаснага выяўленчага мастацтва, дырэктарам якога я стаў.) Вось бачыце, якая кругаверць, як усё замкнулася, як многае ў жыцці бывае лёсавызначальным. Далейшыя падзеі ў маім жыцці разгортваліся як бы па спружыністай спіралі.

Але вернемся, як у народзе кажуць, да сваіх бараноў. У вучылішчы нашым выкладчыкам на першым курсе была Надзея Галоўчанка, якая вяла малюнак і акварэльны жывапіс. Яна была сапраўдным прафесіяналам, выдатна валодала акварэллю. Інтэлігентны, мяккі, прыветлівы чалавек, яна старалася зразумець кожнага студэнта, дапамагчы яму ў авалоданні тэхнікай акварэлі. У нас склаліся добрыя працоўныя адносіны, я яе вельмі паважаў не толькі тады, падчас вучобы, але і ўсё жыццё. Думаю, што і мая любоў да акварэльнага жывапісу сфарміравалася менавіта тады, на першым курсе вучылішча, дзякуючы такому педагогу, як Надзея Іванаўна Галоўчанка.

Хадзіць за дзень даводзілася многа: раніцай на Даўгабродскую, пасля абеду да Опернага тэатра, вечарам на Юбілейную плошчу ў школу. Пад'ехаць на якім-небудзь транспарце не было за што, ды ў большасці кірункаў не было і самога транспарту. У школе я зноў жа сядзеў на "камчатцы" разам з В. Ціханенкам. Мы ў асноўным гулялі ў шахматы, якія стаялі паміж намі на сядзенні парты. Як бы і ўрокамі займаліся, а заадно гулялі. Гэта быў пачатак захаплення шахматамі, якія потым ледзь не павярнулі мой лёс. Але пра тое пазней.

Вучні ў вячэрняй школе былі featureрознага ўзросту, сацыяльнага становішча, але ўзровень падрыхтоўкі ва ўсіх іх быў вельмі нізкі. Гэта я зразумеў з самага пачатку, і майго багажу ведаў хапала, каб без напругі быць першым у класе, ды яшчэ дапамагаць іншым. У нашым класе вучыўся інструктар Фрунзенскага РК КПБ М. Сабадаш, які бліжэй да зімы прапанаваў мне перайсці да яго кватараваць на вуліцу Гвардзейскую ў дзяржаўную кватэру, але з умовай, што я буду дапамагаць яму рабіць урокі.

І мы з Жорам Луканскім перабраліся ў адзін з пакояў да М. Сабадаша. Жора ўжо к гэтаму часу меў мянушку "Піпін кароткі" за яго маленькі рост. Паколькі мы разам хадзілі на заняткі на Даўгабродскую, пара з нас была цікавая, як Дон Кіхот і Санча Панса. Я хударлявы, але высокі ростам, а Жора кароценькі і добра ўкормлены. Мне ж прыляпілі мянушку "мужык" за мае вясковыя вопратку, звычкі і гаворку. Усе вакол гаварылі па-руску, аднаму размаўляць па-беларуску было вельмі цяжка, і я пачаў старацца гаварыць таксама па-руску. Можна ўявіць сабе, якая гэта была "трасянка". Мяне часта перадражнівалі, а як прыехаў у Мядзел і сустрэўся з Г. Астроўскім, той таксама падсмейваўся са змен у маёй гаворцы. Я заўсёды выдатна пісаў дыктанты і сачыненні па-руску, а вось размаўляць не мог. Менавіта з-за гэтых кпінаў я даў сабе зарок ужо тады навучыцца гаварыць на сапраўднай рускай мове без акцэнту, і думаю, што намнога пазней мне гэта ўдалося. Бываючы потым у Ленінградзе або ў Маскве, не даваў падставы западозрыць, што я чысцейшай крыві беларус.

(Працяг будзе.)

ШТО? ДЗЕ? КАЛІ?

9—17 мая

МІНСК

Тэатры

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы

10 мая — "Паўлінка".
11 мая — "Сны аб Беларусі".
12 мая — "Загадкавыя варыяцыі".
13 мая — Прэм'ера! — "Дамскае танга".
14 мая — "Беларусь у фантастычных апавяданнях".
14, 15 мая — Прэм'ера! — "Ядвіга".
16 мая — "Ідылія".
16 мая — Прэм'ера! — "Старамодная камедыя".
17 мая — "Памінальная малітва".
17 мая — "Афрыка".

Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы і балета

15 мая — "Бахчисарайский фонтан".
16 мая — Ж. Бизе "Кармен".
17 мая — "Щелкунчик".

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі

9 мая — Прэм'ера! — П.Пражко "Калі скончыцца вайна".
10 мая — С.Алексіевіч "Чарнобыльская малітва".
11 мая — Прэм'ера! — С.Кавалёў "Дзённік паэта (Інтымны дзённік)".
12 мая — А.Чэхаў "Іванаў".
13 мая — З.Сагалаў "Палёты з анёлам".
14 мая — С.Кандрашоў "Містэр Розыгрыш".
15 мая — У.Караткевіч "Каласы пад сярпом тваім".
16 мая — С.Кавалёў "Сёстры Псіхеі".

Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача

10 мая — "Бармалей".
14 мая — "Ліса і вінаград".
16 мая — "Приключение Бибигона". "Королевство кривых зеркал".

Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр

10, 12 мая — "Небесный тихоход".
13, 14 мая — "Юнона и Авось".
15 мая — Юбілейны вечар народнай артысткі Беларусі Наталлі Гайда.
16 мая — "Доротея".
17 мая — "Бал цветов. Классика и современность".

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М.Горкага

10 мая — Ж.-Ф.Рэньяр "Единственный наследник".
14, 15 мая — Прэм'ера! — А.Астроўскі "Правда — хорошо, а счастье — лучше"
16 мая — Прэм'ера! — Э.Шміт "Распутник".
17 мая — А.Астроўскі "Доходное место".

Беларускі дзяржаўны тэатр лялек

9, 10 мая — "Пеппи Длинныйчулок".
15, 16 мая — "Веселый цирк".
17 мая — "Жуткий господин Ау".

Тэатр-студыя кінаакцёра

10 мая — "Миленький ты мой".
12, 13 мая — "Механический человек".
14, 15 мая — "Очень простая история".
16, 17 мая — "...Забыть Герострата!".

Тэатр "Зьніч"

11 мая — "Красёнцы жыцця".

Дзяржаўны маладзёжны тэатр

11 мая — "Кафе разбитых сердец".
14 мая — Цыганское шоу "Аллюр".
17 мая — "Morfe Acoustic Band".

Канцэрты

Палац Рэспублікі

11 мая — Нацыянальны заслужаны акадэмічны ансамбль танца імя П.Вірскага.
15 мая — мюзікл "Энергия улиц".
17 мая — Надзея Кадышава і ансамбль "Золотое кольцо".

Анонс

19 мая — канцэрт вакальнай групы "Чистый голос".
25 мая — канцэрт Робіна Гіба (Robin Gibb, ex. Bee Gees) у суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра.
26 мая — канцэрт Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры".
28 мая — спявае Дзіма Білан.

Палац прафсаюзаў

12 мая — канцэрт ансамбля этнічнага сюррэалізма НагҮаль.

Сядзіба ТБМ

12 мая — творчая сустрэча з бардаўскім дуэтам Галіны і Барыса Вайханскіх.
15 мая — сустрэча з пісьменнікам Эрнестам Ялугіным.

Канцэртная зала "Мінск"

14 мая — канцэрт Зміцера Вайцюшкевіча.

ГРОДНА

Гродзенскі абласны драматычны тэатр

16 мая — Першы адкрыты фестываль маладзёжнага харэаграфічнага мастацтва "Гродненские кружева".
17 мая — С.Бартохава "Незваный гость".
17 мая — А.Хайт "День рождения кота Леопольда".

Гродзенскі абласны тэатр лялек

10 мая — "Конек-Горбунок".
14 мая — канцэрт гурта "Стары Ольса". А 16 мая "Стары Ольса" з канцэртам у Астрамечава.

ГОМЕЛЬ

Гомельскі дзяржаўны тэатр лялек

9 мая — С.Маршак "Терем-теремок".
10 мая — Г.Андэрсен "Русалочка".
16, 17 мая — Д.Урбан "Приключения Пинга и Понга".

БРЭСТ

Брэсцкі тэатр лялек

10 мая — Е.Тарахоўская "По щучьему велению".

Брэсцкі драмтэатр

15 мая — канцэрт гурта "Стары Ольса".

БАБРУЙСК

Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В.Дуніна-Марцінкевіча

9 мая — канцэртная праграма Нацыянальнага Акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.
10 мая — "Хрустальный башмачок".
15 мая — "Желание любви".
16 мая — "Наполеон и Жозефина".
17 мая — "Огни родного города".
17 мая — "Волшебная лампа Аладдина".

ВІЦЕБСК

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа

12 мая — С.Казлоў "Нельга нам без сябра".
12 мая — У.Драздоў "Шагал... Шагал...".
13 мая — І.Масляніцына "Крыж Еўфрасінні".
15, 16 мая — Ф.Палачанін "Пазычанае шчасце".
17 мая — Ул.Галубок "Ветрагоны".

Беларускі тэатр "Лялька"

10 мая — Р.Кіплінг "Дапытлівы слонік".
14 мая — В.Катаеў "Кветачка-вясёлка".
15, 16 мая — В.Ліванаў, Ю.Энцін "Брэменскія музыкі".
17 мая — С.Яфрэмаў, С.Коган "Яшчэ раз пра Чырвоную Шапачку".

ПРИГЛАШЕНИЕ

Вы давно слушали симфонию?

26 мая Национальный академический Большой театр оперы и балета приглашает на концерт русской симфонической музыки.

Оркестр под управлением заслуженного артиста Украины Виктора Плоскины исполнит два выдающихся произведения русской симфонической классики — Первый фортепианный концерт П.Чайковского и Вторую симфонию С.Рахманинова.

Концерт №1 для фортепиано с оркестром Петра Ильича Чайковского — одно из самых известных и любимых слушателями произведений.

Не случайно продолжением вечера станет музыка Сергея Васильевича Рахманинова. Прозвучит Симфония №2, посвященная наставнику и коллеге Рахманинова, профессору Московской консерватории Сергею Ивановичу Танееву. Симфония №2 — одно из лучших музыкальных посвящений родине.

В концерте примет участие белорусский пианист — лауреат международных конкурсов Ростислав Кример, широко известный как директор и художественный руководитель международного фестиваля Юрия Башмета.

УВАГА!

Маладзёжны тэатр закрыўся

Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр адзначыў юбілей і закрыўся на рэканструкцыю.

Яшчэ ў мінулым годзе тэатр планавалася закрыць на рамонт, але пачынаць перабудову ў разгар тэатральнага сезона адміністрацыя палічыла памылкай. Пасля рэстаўрацыі пляц тэатра павялічыцца ў пяць разоў. З'явяцца новыя грымёркі, пашырыцца гардэроб і глядзельная зала. У тэатры з'явяцца найноўшыя тэхнічныя канструкцыі.

Мяркуецца, што рамонт працягнецца тры гады. У гэты час артысты будуць працаваць на іншых пляцоўках, прычым не толькі Мінска, але і Мінскай вобласці. Бліжэйшыя спектаклі плануецца паказаць на малой сцэне Палаца Рэспублікі.

Першай прэм'ерай на чужой тэрыторыі стане спектакль, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі — "Апошні ліст", які адбудзецца 26 мая.

ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ

29-гадовы Пётр Ялфімаў ажаніўся на 56-гадовай Таццяне Касмачовай

Такую навіну днямі распаўсюдзілі некаторыя расійскія выданні. Журналісты заўважылі, што ў Маскве, дзе Пётр Ялфімаў прадстаўляе Беларусь на "Еўрабачанні", яны жывуць у адным нумары гатэля.

"Московский комсомолец" нават апублікаваў інтэрв'ю з **Пятром Ялфімавым**, дзе спявак быў прадстаўлены "*маладым чалавекам з асляпляльнай усмешкай і чорцікамі ў вачах, які літаральна свеціцца ад шчасця*". Маўляў, гэта з-за таго, што пару дзён таму Пётр нарэшце рашыўся на шлюб з каханай жанчынай.

У артыкуле Ялфімаў называе **Таццяну Касмачову** той адзінай, дзякуючы якой ён жыве, піша, спявае і існуе.

"*Мне напляваць, што пішуць у прэсе,* — распавёў Ялфімаў журналістам. — *Мы даўно разам і нас гэта ніколечкі не ламае. Усе родныя, блізкія і сябры даўно аб гэтым ведаюць і ўспрымаюць нас як адзінае цэлае. Хтосьці гаворыць, што "гэта — для іміджу". Нічога падобнага. Не люблю выстаўляць асабістае жыццё напаказ, і дзякуй богу, што мы ўмеем падзяляць працу і асабістае жыццё...*"

Літаральна на наступны дзень Таццяна Касмачова абвергла інфармацыю пра шлюб.

"*Афіцыйна мы не распісваліся,* — сказала яна. — *Гэта жарт. Магчыма, цікавасць да Ялфімава выклікана тым, што ён доўгія гады гуляў у Клубе вясёлых і знаходлівых...*"

Варта адзначыць, што цікавасць да гісторыі адносін спевака і прадзюсера падаграваецца дзякуючы значнай розніцы ва ўзросце паміж закаханымі. Пятру - 29 гадоў, а Таццяне — 56.

Чый яшчэ шлюб называюць няроўным?

Расіянам да няроўных шлюбаў, у якіх менавіта жанчына старэйшая за свайго абранніка, не прывыкаць. Так, апошнім часам **Ала Пугачова** не хавае сваіх адносін з **Максімам Галкіным** (розніца паміж імі 30 год). **Ларыса Доліна** даўно жыве з музыкантам **Іллёй Спіцыным** (розніца 13 гадоў), **Надзея Бабкіна сустракаецца са спеваком Яўгенам Горам** (розніца 30 год).

КАМЕНТАРЫЙ ПСІХОЛАГА

«Такія шлюбы асуджаны на распад»

"Шлюбы мужчын з жанчынамі, якія нашмат старэйшыя за іх, узнікаюць па розных прычынах, — *зазначыў у адным са сваіх інтэрв'ю прафесар псіхіятрыі* **Міхаіл Вінаградаў**. — Ёсць жанчыны-маці, якім падабаецца апекаваць. Гэта моцная, аўтарытарная асоба, ёй падабаецца выхоўваць слабага мужчыну. Яе бонус — інтэнсіўны секс з маладым партнёрам. Яна рэалізуе сябе як лідэр і ў сямейных, і ў сексуальных адносінах.

У аснове паводзін мужчын у падобным няроўным шлюбе часта выяўляецца сутэнёрская пазіцыя. Яго кормяць, апранаюць, даюць грошы, а плата за гэта даволі прыемная — секс. Да таго ж багатая дама пакіне спадчыну! Яшчэ адзін плюс: дама ва ўзросце, здольная "купіць" маладога мужчыну, як правіла, мае высокі сацыяльны статус і ўводзіць маладога мужа ў вышэйшы свет.

Яшчэ адзін плюс для маладога мужчыны — неспрактыкаванасць у сексуальным плане. А сталая любоўніца навучыць яго ўсяму.

Здараецца і саюз двух палавых перакрутаў: геранатафіла і педафілкі.

У цэлым такія шлюбы асуджаны на распад. Што мы назіраем у харызматычных пар? Яна — старая, ён — удалец малайчына, на якім вісне маса прыгажунь. З цягам часу пачынаецца крыўда, рэўнасць... Адносіны развальваюцца. Пры гэтым, ужо набраўшыся вопыту ў любоўнай навуцы, вучань імкнецца сам стаць настаўнікам і мяняе старую жонку на маладую".

Валерыя ЕСІНА.

РЭКЛАМА

Народная воля
http://www.nv-online.info
8—11 МАЯ 2009 г.

ПОНЕДЕЛЬНИК, 11 МАЯ

Первый

05.35 "Как сказал Джим". Сериал.
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 "Новости".
06.05, 07.05, 08.10 "Доброе утро, Беларусь!"
06.45, 07.45, 18.50, 00.55 "Зона Х".
07.30, 08.25, 11.55 "Деловая жизнь".
08.20 "Готовим вместе".
08.30 "В мире моторов".
09.05 "Note Bene".
09.35 "Звездные танцы".
10.55 "Здоровье".
11.25 "Собственной персоной".
12.10, 13.55, 14.55, 15.40, 16.40, 17.45, 21.50 "Евровидение. Москва-2009".
12.15 "Беларусь. История Победы".
12.20 "Альпийская баллада". Худ.фильм.
14.05 "Жизнь как жизнь".
15.15, 19.20 "Новости региона".
15.25 "Off Stage Life".
15.45 "Интуиция".
16.45 "Жаркий лед". Сериал.
17.50 "Две стороны одной Анны". Сериал.
19.35 "Арена".
19.55 "Ответный ход".
21.00 "Панорама".
21.55 Футбол. Лига чемпионов УЕФА. Видеожурнал.
22.30 "Поворот". Худ.фильм.
01.05 "День спорта".

ОНТ

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 00.50 "Наши новости".
06.05 "Наше утро".
09.05 "Контуры".
10.10 "Дыхание планеты".
10.40 Мультфильм.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 01.05 "Новости спорта".
11.10, 13.10 "Агитбригада «Бей врага!»". Худ.фильм.
13.30 "Хочу знать".
15.10 "Жаркий лед". Сериал.
16.15 "Песні маёй краіны".
18.20 "Гуманоиды в королеве". Сериал.
19.00 "Евровидение. За минуту до старта".
20.00 "Время".
21.05 "Выбор".
22.05 "Застава Жилина". Сериал.
23.25 "Обратный отсчет".
23.55 "Мотофристайл". Мировая серия.

РТР-Беларусь

07.00 "Володькина жизнь". Худ.фильм.
09.15, 11.15 "Семнадцать мгновений весны". Сериал.
11.00, 14.00, 19.00 "Вести".
12.20, 17.55 "Леди мэр". Сериал.
13.15, 22.45 "Кулагин и партнеры". Сериал.
13.50, 16.50, 18.50, 23.15 "Новости - Беларусь".
14.15 "Небесные ласточки". Худ.фильм.
17.00 "Я очень люблю эту жизнь...". Наталья Гундарева. Док.фильм.
19.20 "Специальный корреспондент".
19.50 "Кармелита". Сериал.
20.45 "Красный жемчуг любви". Сериал.
22.30 "Ничего личного".
23.25 "Дети из пробирки". Док.фильм.

НТВ-Беларусь

06.25 "Май". Худ.фильм.
08.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 "Сегодня".
08.20 "Русские сенсации".
09.00 "Дикий мир".
09.25 "Едим дома".
10.20 "Африканец". Худ.фильм.
12.00 "Дачный ответ".
13.25 "Перегон".
16.20 "Призрачный меч". Худ.фильм.
18.25 "Особо опасен!".
19.30 "Про любовь". Худ.фильм.
21.20 "Бандитки". Худ.фильм.
23.05 "Желтый дракон". Сериал.
23.55 "Футбольная ночь".

СТВ

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 "24 часа".
06.10, 07.40 "Утро. Студия хорошего настроения".
09.30 "Большой завтрак".
10.00 "Пять историй".
10.40 "Спортивная неделя".
11.00 "Танго втроем". Сериал.
11.50, 18.30 "Сила притяжения". Сериал.
12.40, 17.30 "Званый ужин".
13.50 "В августе 44-го...". Худ.фильм.
17.00 "Я очень люблю эту жизнь...". Наталья Гундарева. Док.фильм.
19.20 "Специальный корреспондент".
19.50 "Кармелита". Сериал.
20.45 "Красный жемчуг любви". Сериал.
22.30 "Ничего личного".
23.00 "Столичный футбол".
23.30 "Боец". Сериал.
00.25 "Громкое дело".

ЛАД

06.55 "ЛАДное утро".
07.55, 17.05 "Вкусно" с Борисом Бурдой".
08.15 "Телебарометр".
08.35 "Все о безопасности".
09.00 "В этот день".
09.05 "Час суда. Дела семейные".
10.00, 17.35 "Наследница". Сериал.
10.55 "Рецепт колдуньи". Худ.фильм.
12.30 "Гаспадар".
13.00 "Дело было в Гавриловке". Сериал.
13.50 "Галактический футбол". Мультсериал.
14.15 "Бухта капитанов".
14.55 "Внеклассный час".
15.10 "Тайный вкус".
15.40, 21.20 "Экспедиция".
16.05 "Час суда" с Павлом Астаховым".
18.35 "Новости культуры".
18.50 "Срочно в номер!". Сериал.
19.55 "Белорусское "Времечко".
20.55 "Калыханка".
21.25 "Герой". Худ.фильм.
23.15 Футбол. Чемпионат Англии. Обзор тура.
00.10 "Хоккей. Формула игры".

Мир

04.55 "Афиша".
05.00, 10.00 "Любимые актеры".
05.10 "Военно-полевой роман". Худ.фильм.
06.45 "Тик-так".
07.00 "Легкая жизнь".
07.30, 23.00 "Республика сегодня".
07.45, 02.40 "Истории двух фотографий". Док.фильм.
08.05, 01.45 "Живая история".
09.00 "Вместе".
10.10, 12.10 "Долгие версты войны". Худ.фильм.
12.00, 15.00, 18.00, 21.00 "Новости Содружества".
14.30 "Лесси и рейнджер Корри". Сериал.
15.20 "Рандеву со звездой".
15.55 "Билет на сегодня".
16.00 "Дружная семейка". Сериал.
17.00, 04.00 "Прогресс".
18.20 "Акценты".
18.30 "По мотивам рассказов В.Шукшина". Сериал.
19.30 "Общий интерес".
20.05 "Слово за слово".
21.20, 03.00 "Параллельно любви". Сериал.
